

ДАКЛАДНЫЯ НАВУКІ – НЕ ДЛЯ ДЗЯЎЧАТ?

ЧЫРВОНКА

ЯК СТАНОВЯЦЦА ДРЭСІРОЎШЧЫКАМ ДЭЛЬФІНАЎ

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

7 ЛЮТАГА 2019 г. ЧАЦВЕР № 25 (28892)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:**

*«Энтузіясты, якія развіваюць арганічнае земляробства, заслугоўваюць падтрымкі і ўвагі з боку мясцовых улад. Арганічнае земляробства — перспектыўны напрамак у сельскай гаспадарцы. Важна, што ў Гродзенскай вобласці ёсць людзі, гатовыя яго развіваць, займацца ім. Мы заўсёды стараемся падтрымліваць фермерскі рух, прапрацуем варыянты вырашэння, якія б задаволілі ўсіх зацікаўленых. Арганічнае земляробства ў рэгіёне развіваюць не толькі фермеры. Напрыклад, ёсць цікавасць інвестара да стварэння такой буйной гаспадаркі».*

# ДЛЯ ЎСІХ, ХТО ПІША І ЧЫТАЕ

## У сталіцы адкрылася XXVI Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш

Новы кніжны год пачаўся ў зусім не зімовай, цёплай атмасферы — старт яму дала Мінская кніжная выстаўка-кірмаш, якая праходзіць першай сярод аналагічных буйных міжнародных мерапрыемстваў. Сёлета ўдзел у культурна-асветніцкім форуме бяруць 439 экспанентаў з 35 краін свету, у праграме выстаўкі — больш як 400 кніжных прэзентацый, творчых сустрэч, аўтограф-сесій, семінараў, круглых сталоў і дыскусій, а цэнтральным экспанентам выступае Расія. І хто б са скептыкаў што ні казаў пра падзенне цікавасці да кнігі, але рэальнасць дэманструе адваротны працэс: гасцей і ўдзельнікаў выстаўкі ў першы ж дзень было так многа, што нават вялізная плошча павільёна «БелЭкспа» ледзьве ўмяшчала ўсіх ахвотных ацаніць кніжныя навінкі і сустрэцца з цікавымі аўтарамі.






Фота Андрэя САЗОНАВА.

Прывітанне кіраўніка нашай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі ўдзельнікам выстаўкі і міжнароднага сімпозіума літаратараў «Пісьменнік і час» агучыў на ўрачыстай цырымоніі адкрыцця форуму намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір ЖАЎНЯК. *«На працягу многіх гадоў гэты форум з'яўляецца значнай культурнай падзеяй у жыцці Беларусі, збірае разам публіцыстаў, пісьменнікаў і выдаўцоў усяго свету, умацоўвае прафесійныя і дзелавыя сувязі паміж імі. Кнігавыдавецтва па-ранейшаму застаецца візітоўкай нашай краіны, звязвае яе багатае гістарычнае мінулае і памкненне сучаснікаў да захавання і ўзбагачэння культурнай спадчыны папярэдніх пакаленняў»,* — гаворыцца ў прывітанні. Прэзідэнт Беларусі таксама выказаў перакананне, што мерапрыемствы будзе садзейнічаць папулярызацыі кнігі як асновы адукацыі і духоўнага развіцця, пошуку новых ідэй і ўзаемавыгадных кантактаў у гуманітарнай сферы.

СТАР. 4

## КОРАТКА

● На сустрэчы, якая адбудзецца 13 лютага, Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмяркуюць найбольш актуальныя пытанні беларуска-расійскага супрацоўніцтва, у тым ліку работу сфарміраванай па рашэнні прэзідэнтаў двухбаковай групы.

● **Пайшоў з жыцця акадэмік-гісторык Міхаіл Касцюк, які стаў ініцыятарам падрыхтоўкі фундаментальнага выдання, прысвечанага тысячагадовай гісторыі Навагрудка.**



● З грыпам у Літве на мінулым тыдні шпіталізавана 470 чалавек, у тым ліку 59 дзяцей ва ўзросце да двух гадоў. У аддзяленні інтэнсіўнай тэрапіі знаходзіцца 33 хворыя.

ISSN 1990 - 763X

Месца дзеяння

# СТАЎКА НА РУПАРА

## Прадпрымальнік з Краснаполля заснаваў свой бізнес у неперспектыўнай вёсцы, і ў землякоў прачнулася цікавасць

***Наш сённяшні герой мог бы з поспехам рэалізаваць сябе ў любым іншым месцы, але ён выбраў для гэтага сваю малую радзіму. Дзякуючы такім людзям і жыве наша глыбінка. Калі б не яны, магчыма, некаторых вёсачак сёння ўжо і не існавала б.***

Прыгажуня з гаспадаркі Юрыя.



**Вёска Гарадзецкая маленькая, але вельмі маляўнічая. Шмат дрэў і сенажацяў, адным словам — раздолле. Тут разумееш, чаму Юрый ЗЯМЦОЎ зрабіў стаўку на коней. Нават, калі іх няма паблізу, душа рвецца вонкі і тупацiць у нецярпенні, як неаб'езджаны скакун.**

### ХОБІ СТАЛА ПРАЦАЙ

— Жыў у сельскай мясцовасці, з самага дзяцінства сярод коней. Бацькі былі толькі рады. Гэта ж нармальна, калі сын дапамагае араць, скародзіць. А ў калгасе, як толькі пачынаецца нарыхтоўка сена, мы хутчэй заскокваем на нашых саўрасак — і дапамагаць. Касцам ваду падвозіў, напэўна, яшчэ ў класе пятым, — расказвае пра сябе мясцовы прадпрымальнік, вялікі аматар каней Юрый Зямцоў, заснавальнік КФГ «Зямцоў».

Калі ў восьмым класе прыйшлі агітаваць паступаць у Клімавіцкі аграрны тады яшчэ тэхнікум, Юрый доўга не раздумваў. А што было сумнявацца, калі там якраз адкрылі конна-спартыўную школу. Пра алімпіяды і кубкі, прызнаецца, думкі не было, а вось тое, што зможа знаходзіцца бліжэй да сваіх улюбёнцаў, грэла. І спецыяльнасць ветэрынара выбраў з такім разлікам, што ў будучыні будзе ім дапамагаць. Пакуль вучыўся, сяброў знайшоў па інтарэсах, з некаторымі і зараз падтрымлівае сувязі.

СТАР. 13

Ва ўрадзе

# Падыходзіць па-гаспадарску

## На пасяджэнні Саўміна разгледзелі эфектыўнасць выкарыстання дзяржмаёмасці

**Як адзначыў падчас пасяджэння прэм'ер-міністр Сяргей РУМАС, усе аб'екты дзяржаўнай уласнасці, якія не выкарыстоўваюцца, неабходна эфектыўна ўключыць у гаспадарчы абарот. Работа па прыцягненні ў абарот маёмасці арганізуецца ў адпаведнасці з Указам № 294. Штогод па ўзгадненні з Прэзідыумам Савета Міністраў зацвярджаецца пералік аб'ектаў для ўключэння іх у эканамічны абарот, паведамілі ў прэс-службе ўрада.**

«Кіраўніком дзяржавы неаднаразова ўказвалася на неабходнасць эфектыўнага задзейнічання ўсіх маёмасных аб'ектаў, пераправерання іх балансатрымальнікаў у высокапрыбытковы актыў або ўключэння ў гаспадарчы абарот іншым чынам, у тым ліку праз продаж альбо перадачу іншаму ўласніку для адкрыцця новага бізнесу і стварэння новых рабочых месцаў», — падкрэсліў Сяргей Румас.

Паводле афіцыйных даных, у Беларусі на канец мінулага года не выкарыстоўвалася больш за 2,26 млн кв. м памяшканняў, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці. Гэта каля двух працэнтаў ад усёй нерухомай дзяржаўнай маёмасці. «Акрамя недаатрыманых даходаў і страт бюджэту ўласнікі гэтых памяшканняў нясуць павышаныя выдаткі на ўтрыманне такіх аб'ектаў», — заўважыў кіраўнік урада. Усяго ў 2018 годзе органамі дзяржкіравання работа па прыцягненні ў абарот праводзілася на 2870 аб'ектах. Праведзена звыш трох тысяч аўкцыёнаў па рэалізацыі маёмасці, на таргі выстаўлялася больш за 1,5 тысячы аб'ектаў з далейшым паніжэннем пачатковай цаны. Рэальна прададзена 658 аб'ектаў. Пры гэтым 440 аб'ектаў не зацікавілі пакупніка нават пачатковай цаной у адну базавую велічыню.

Механізмы работы з невыкарыстоўваемымі аб'ектамі дзяржаўнай уласнасці ў Беларусі плануецца ўдасканаліць, паведаміў **старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Андрэй ГАЕЎ**, інфармуе БелТА. «Падрыхтаваны праект указа кіраўніка дзяржавы па ўдасканаленні ўліку, вядзенні адзінага рэестра дзяржмаёмасці. Змяненні накіраваны перш за ўсё на тое, каб павысіць актуальнасць даных, якія ўносяцца ў рэестр. Гэта будуць рабіць непасрэдна самі праваўладальнікі пад кантролем тэрытарыяльных камітэтаў дзяржмаёмасці», — сказаў Андрэй Гаеў.

Увесь працэс работы з данымі будзе арганізаваны ў лічбавай форме. «Любая справаздачнасць, перадача інфармацыі будуць ажыццяўляцца з лічбавых носьбітаў. Інфармацыя пра дзяржмаёмасць будзе прывязаная да карты. Ужо сёння адзіная база маёмасці, якая не выкарыстоўваецца, прывязана да картаграфічнага інтэрфейсу, і ў тэставым рэжыме можна бачыць не толькі дакладнае месцазнаходжанне аб'ектаў на карце, але і спадарожную інфармацыю, напрыклад, фатаграфіі», — растлумачыў старшыня Дзяржкаммаёмасці.

Праект указа — наступны крок у пытаннях удасканалення парадку распараджэння дзяржаўнай маёмасцю. «У адпаведнасці з праектам дакумента, пашыраецца пералік тэрыторый, на якіх можна адразу, без паэтапнага паніжэння цаны, прадаваць аб'екты за адну базавую велічыню. Даецца магчымасць удзельнічаць у аўкцыёнах па продажы такой маёмасці адразу фізічным асобам, каб яны маглі займацца рамеснай дзейнасцю, дзейнасцю ў сферы агратурызму. Паляпшаюцца ўмовы, звязаныя з атрыманнем растэрміноўкі аплаты. Калі сёння яна даецца на адзін год (для арандатараў — да пяці гадоў), то цяпер па агульным правіле растэрміноўка будзе прадастаўлена на тэрмін да трох гадоў, што зробіць больш камфортнымі ўмовы выкупу дзяржаўнай маёмасці», — адзначыў Андрэй Гаеў.

Колькасць нявыкарыстаных аб'ектаў дзяржаўнай нерухомасці ў 2018 годзе зменшылася амаль на 1,8 тысячы. «Каля 300 аб'ектаў былі набытыя за адну базавую велічыню для таго, каб развіваць малы і сярэдні бізнес, ствараць рабочыя месцы. Па выніках мінулага года бачная станоўчая дынаміка, усе паказчыкі атрымалася палепшыць у параўнанні з 2017-м», — дадаў старшыня Дзяржкаммаёмасці.

## Беларусь рыхтуецца ўзорна правесці II Еўрапейскія гульні

**Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Беларусі, старшыня аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні гульняў у Беларусі Сяргей Румас на сустрэчы з прэзідэнтам Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў Янезам Качыянчычам у Рыме, паведаміла БелТА.**

Прэм'ер-міністр адзначыў, што да старту гульняў застаецца 135 дзён і ўсе неабходныя арганізацыйныя мерапрыемствы знаходзяцца на яго пастаянным кантролі. Еўрапейскія алімпійскія камітэты задаволены падрыхтоўкай Беларусі да правядзення II Еўрапейскіх гульняў, адзначыў прэзідэнт ЕАК. «Я ведаю, што вы вельмі адданыя гэтай справе», — заўважыў Янез Качыянчыч. ЕАК таксама высока ацэньвае працу фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года».

Янез Качыянчыч прапанаваў асобна абмеркаваць узаемадзеянне па двух пытаннях. «Першае — гэта падрыхтоўка кадраў. Мы набліжаемся да правядзення гульняў, на ўсіх пазіцыях павінны быць вельмі кампетэнтныя і добра падрыхтаваныя людзі. Другое пытанне — працэс прыняцця рашэнняў. На фінальнай стадыі набліжэння да правядзення гульняў аргкамітэт і яго аператыўныя штабы павінны мець максімальныя паўнамоцтвы, таму што пытанні павінны вырашацца вельмі хутка», — звярнуў увагу прэзідэнт ЕАК.

Па выніках сустрэчы з Сяргеем Румасам прэзідэнт ЕАК расказаў журналістам, што з прэм'ер-міністрам абмяркоўваліся рабочыя моманты, якія, як правіла, узнікаюць пры арганізацыі маштабных мерапрыемстваў. Нацыянальны аргкамітэт і ЕАК будуць каардынаваць намаганні, каб Еўрапейскія гульні 2019 года прайшлі паспяхова.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Дональд Трамп выступіў з пасланнем да кангрэса аб становішчы краіны



У сваёй прамове прэзідэнт ЗША адзначыў, што яго адміністрацыя за апошнія два гады дабілася «імклівага прагрэсу» ў эканоміцы ЗША, а ўзброеныя сілы краіны сталі самымі магутнымі ў свеце. Ён таксама зноў узняў пытанне фінансавання сцяны на мяжы з Мексікай.

«Пасля 24 месяцаў імклівага прагрэсу нашай эканоміцы зайздросціць увесь свет, нашы ваенныя — самыя магутныя на зямлі, і Амерыка выйграе дзень за днём», — сказаў Трамп. «Мы развязалі рэвалюцыю ў амерыканскай энергетыцы — ЗША цяпер з'яўляюцца вытворцам нафты і прыроднага газу нумар адзін у свеце», — адзначыў ён. Адзінае, што можа спыніць моцную эканоміку ЗША, — «дурныя войны, палітыка ці недарэчныя партызанскія расследаванні», падкрэсліў прэзідэнт. Дональд Трамп заклікаў Дэмакратычную і Рэспубліканскую партыі да супрацоўніцтва. «Мы павінны ажыццяўляць кіраўніцтва не як дзве партыі, а як адна нацыя», — адзначыў ён, дадаўшы, што палітыкам неабходна «знаходзіць кампрамісы і супрацоўнічаць».

Трамп заклікаў Кангрэс за астатнія дзесяць дзён да пачатку новага «шатдаўна» прыняць бюджэт, які ўмацуе мяжу з Мексікай і скончыць з іміграцыяй.

«Наш маральны абавязак — стварыць іміграцыйную сістэму, якая зможа абараніць жыцці і рабочыя месцы нашых грамадзян», — адзначыў Трамп.

### Парламент Францыі ўхваліў закон аб абмежаванні правоў дэманстрантаў

Ніжняя палата парламента Францыі ў аўторак, 5 лютага, ухваліла законапраект, які пашырае паўнамоцтвы праваахоўнікаў па супрацьдзеянні хуліганам і вандалам.

Калі закон будзе падтрыманы ў сенаце, паліцыя і прадстаўнікі ўладаў змогуць без рашэння суда забараняць удзельнічаць у мітынгах асобам, якіх падазраюць у хуліганскіх паводзінах. За парушэнне можа пагражаць штраф у памеры 7500 еўра або шэсць месяцаў зняволення. Плануецца таксама забараніць дэманстрантам выкарыстоўваць любыя віды маскіроўкі, за гэта можна атрымаць штраф у памеры 15 тысяч еўра або адзін год зняволення.

Праціўнікі ініцыятывы крытыкуюць яе за парушэнне грамадзянскіх правоў, у прыватнасці, права на свабоду сходаў. Назіральнікі звязваюць законапраект з пратэстамі руху «жоўтых камізэлек», якія ўспыхнулі ў Францыі ў лістападзе 2018 года і суправаджаліся сутыкненнямі дэманстрантаў з паліцыяй і актамі вандалізму.

### Папа Рымскі ўпершыню прызнаў факты дамаганняў святароў да манашак

Папа Рымскі Францыск упершыню публічна прызнаў факты сексуальнага гвалту святароў і біскупаў у дачыненні да манашак. «Так, былі такія святары і нават біскупы, якія рабілі гэта», — сказаў ён на борце папскага самалёта, вяртаючыся пасля візіту ў Аб'яднаныя Арабскія Эміраты ў Ватыкан.

Па словах пантыфіка, сексуальны гвалт супраць манашак можа здарацца паўсюль, аднак асабліва часта гэта адбываецца ў «некаторых новых супольнасцях і ў некаторых рэгіёнах». Пры гэтым ён не ўдакладніў, пра якія менавіта супольнасці і рэгіёны ідзе гаворка. Францыск сказаў, што кіраўніцтва касцёла ўжо даўно працуе над вырашэннем гэтай праблемы, некаторыя святары былі адхілены ад служэння, а жаночыя прыходы, дзе сексуальны гвалт адбываўся асабліва часта, расфарміраваныя.

Камунальныя стасункі

# ХТО ЗАПЛАЦІЦЬ ЗА НЯЯКАСНЫЯ ПАСЛУГІ?

**У Беларусі знізяць аплату насельніцтву за няякасна аказаныя жыллёва-камунальныя паслугі, заявіў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір КУХАРАЎ у ходзе пашыранага пасяджэння выніковай калегіі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, паведамілі ў прэс-службе ўрада. Адпаведны нарматыўны прававы акт ужо падрыхтаваны. Паводле слоў віцэ-прэм'ера, арганізацыя, якая не забяспечвае якаснага аказання паслуг, будзе часткова кампенсаваць іх аплату. У прыватнасці, такое новаўвядзенне можа з'явіцца для паслугі па водазабеспячэнні.**

Як стала вядома, беларускія дэпутаты рыхтуюць да першага чытання праект закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон «Аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг». Папраўкі канкрэтызуюць віды ЖКП, крытэрыі іх якасці, правы і абавязкі спажыўцоў і пастаўшчыкоў гэтых паслуг, што пашырае магчымасці грамадзян для абароны сваіх правоў. Аб гэтым карэспандэнту БелТА паведаміла **член Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Палаты прадстаўнікоў Наталля ЖЫБУЛЬ.**

Адной з галоўных задач сёлета перад арганізацыямі сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі будзе зніжэнне выдаткаў. «Мы бачым вельмі вялікі рэзерв у жыллёва-камунальнай гаспадарцы для зніжэння выдаткаў. Трэба зрабіць усё для таго, каб знізіць выдаткі, натуральна, гэта будзе адбівацца на тарыфах для насельніцтва», — заўважыў Уладзімір Кухараў.

Удасканальваюцца падыходы і да капітальнага рамонту. Падрыхтаваны праект указа па сумесным з насельніцтвам правядзенні цеплавой мадэрнізацыі. Ён узгоднены з усімі зацікаўленымі і падрыхтаваны для накіравання Прэзідэнту. Сярод задач таксама замена ліфтаў у жылфондзе і перавод кацельняў на мясцовыя віды паліва.

Віцэ-прэм'ер нагадаў, што ў адпаведнасці з даручэннямі кіраўніка дзяржавы стаіць задача да 2025 года поўнасцю забяспечыць насельніцтва якаснай пітной вадой. Для гэтага ў краіне трэба будзе пабудаваць каля 1340 станцый абезжалезвання, ужо сёлета іх плануецца запусціць не менш як 260. «У наступныя некалькі гадоў з улікам дамоўленасцяў з міжнароднымі банкамі, якія гатовыя даць крэдыты для вырашэння праблемы, гэтая задача будзе вырашана», — рэзюмаваў Уладзімір Кухараў.

Як паведаміў намеснік прэм'ер-міністра, у Беларусі будуць укараняць новыя падыходы да збору і перапрацоўкі другасных матэрыяльных рэсурсаў. «Збор і перапрацоўка другасных матэрыяльных рэсурсаў — гэта вельмі важная задача для краіны, і мы тут маем вельмі вялікія рэзервы для работы. Таму ў найбліжэйшы час будзе прыняты шэраг нарматыўных і кіраўніцкіх рашэнняў, каб паўсюдна забяспечыць збор другасных матэрыяльных рэсурсаў і паглыбленую перапрацоўку», — адзначыў віцэ-прэм'ер.

**Кар. «Звязды».**

# АДТЭРМІНОЎКА НА МЕСЯЦ

## Жыроўкі па поўным тарыфе незанятыя атрымаюць у сакавіку

**Інфармацыю пра тое, ці ўключаны грамадзянін у спіс незанятых, размесцяць ужо ў жыроўках за студзень. Але налічваць плату па поўным тарыфе за гарачую ваду за мінулы месяц не будуць. Пра гэта паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.**

Урад прыняў такое рашэнне, каб тыя, хто трапіў у базу, мелі дадатковую магчымасць пацвердзіць сваю занятасць ці цяжкую жыццёвую сітуацыю яшчэ і ў лютым. Калі ж грамадзянін гэтага не зробіць, то плату за гарачую ваду па стапрацэнтным тарыфе яму выставяць у жыроўцы за люты з пераразлікам за студзень.

Даведацца, ці трэба вам плаціць камуналку па поўнай, можна пры яе аплаце праз АРІП. А з 11 лютага — на партале дзяржаўных паслуг праз электронную паслугу 3.33.04.2 «Атрыманне звестак аб уключэнні грамадзян у спіс працаздольных грамадзян, не занятых у эканоміцы, якія аплачваюць паслугі, вызначаныя Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, па цэнах (тарыфах), што забяспечваюць поўную кампенсацыю эканамічна абгрунтаваных затрат на іх аказанне». Для гэтага патрэбны электронны лічбавы подпіс ці ўнікальны ідэнтыфікатар (логін і пароль).

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у вобласці навукі і тэхнікі, доктара хімічных навук, прафесара ЛЕСНІКОВІЧА Анатоля Іванавіча і выказваюць шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

Ігар ПЕТРЫШЭНКА:

# «ТРЭБА, КАБ ДА НАС ЕХАЛІ ВУЧЫЦЦА, А НЕ НААДВАРОТ»

**«Узмацненне ўвагі да праблем адукацыі — агульнасусветная тэндэнцыя. Адукаваны чалавек, здольны самастойна асвойваць новыя веды, становіцца найважнейшай каштоўнасцю і асноўным капіталам сучаснага грамадства. Трэба крытычна і прынцыпова прааналізаваць стан спраў па ўсіх узроўнях адукацыі, выявіць праблемныя і "вузкія" месцы і намеціць план дзеянняў па ўдасканаленні і развіцці сістэмы адукацыі з улікам даручэнняў кіраўніка дзяржавы і ўрада, — заявіў на выніковай калегіі Міністэрства адукацыі намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА. — Прыцягвайце да гэтай работы вучоных, педагогаў-практыкаў, калі трэба, незалежных экспертаў. Але кожны крок павінен шырока абмяркоўвацца, бо мы не маем права на памылкі ў такой уразлівай для грамадства сферы, як адукацыя».**



Фота БелТА.

Ігар Петрышэнка звярнуў увагу на важнасць павышэння ў агульнаадукацыйнай школе якасці адукацыі па дысцыплінах прыродазнаўча-матэматычнага цыкла і замежных мовах. «Трэба будзе таксама зрабіць падручнікі больш простымі для ўспрымання, павысіць эфектыўнасць арганізацыі шостага школьнага дня. Гэту работу неабходна завяршыць да пачатку новага навучальнага года. 1 верасня дзеці павінны вучыцца па абноўленых праграмах і падручніках», — сказаў віцэ-прэм'ер.

Урад неаднаразова звяртаў увагу на пытанні аснашчэння школ спартыўным інвентаром і абсталяваннем. «Сёлета для іх было цэнтралізавана закуплена 12 тысяч пар пластыкавых лыжаў, мацаванняў і чаравікаў. Але якая сітуацыя складваецца з інвентаром па летніх відах спорту? У якім стане знаходзяцца спартыўныя залы, школьныя стадыёны? Мяркую, не ўсё тут у нас добра», — канстатаваў віцэ-прэм'ер і прывёў статыстычныя даныя, паводле якіх забяспечанасць фізкультурным і спартыўным інвентаром у школах складае ўсяго 65 %, ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай адукацыі — 66 %, сярэдняй спецыяльнай — 57,2 %, вышэйшай — 51,1 %.

«Прыярытэтам у рабоце ўсіх устаноў адукацыі павінна стаць не толькі павышэнне якасці ведаў навучэнцаў, але і захаванне, умацаванне іх здароўя», — падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра. Ён даручыў Міністэрству адукацыі правесці маніторынг стану спартыўнай базы ўстаноў адукацыі, выпрацаваць разам са старшынямі аблвыканкамаў канкрэтныя планы па абнаўленні і ўмацаванні гэтай базы, адшукаць на гэтыя мэты патрэбныя сродкі.

Непакоіць віцэ-прэм'ера і высокі ўзровень траўматызму ва ўстановах адукацыі. Летась у краіне адбылося 67 выпадкаў траўматызму ў дашкольных установах і 741 выпадак — у школах, прычым 258 выпадкаў — на ўроках фізічнай культуры. «Я прашу разабрацца з забеспячэннем бяспекі дзяцей падчас іх знаходжання ва ўстановах адукацыі самым сур'ёзным чынам. Работа па прафілактыцы і папярэджанні няшчасных выпадкаў не павінна быць фармальнай. А мы, як правіла, пачынаем прымаць меры толькі пасля няшчасных выпадкаў, як гэта адбылося з катаннем дзяцей на цюбінгах», — канстатаваў Ігар Петрышэнка.

У цэнтры ўвагі павінна быць і канкурэнтаздольнасць нашай вышэйшай школы.

— Я не зусім разумею некаторую самазаспакоенасць рэктараў ВНУ. Сёння нашы суседзі (Польшча, Літва, Чэхія) пачынаюць актыўна прыцягваць на навучанне беларускую моладзь, прапануючы ім розныя ўмовы і прэферэнцыі, у тым ліку навучанне на англійскай мове, з выкарыстаннем самых сучасных тэхналогій. А мы глядзім на гэта, як староннія назіральнікі, — кажа Ігар Петрышэнка. — Трэба выпрацаваць прынцыпова новыя падыходы да арганізацыі адукацыйнага працэсу, прадугледзеўшы пашырэнне падрыхтоўкі на замежных мовах, прыцягваць выкладчыкаў вядучых замежных універсітэтаў, вопытных кіраўнікоў і спецыялістаў-практыкаў з найбольш паспяховых айчынных структур і арганізацый. Трэба, каб да нас ехалі вучыцца, а не наадварот.

Нацыянальная сістэма адукацыі павінна быць арыентаваная на патрэбы рынку працы. На думку намесніка прэм'ер-міністра, дзеючая мадэль прафесійнай адукацыі з'яўляецца недастаткова адкрытай сучасным патрэбам эканомікі, рэдка прысутнічаюць такія формы навучання, як праектныя распрацоўкі, трэнінгі, стажыроўкі на вытворчасці і ў навукова-даследчых арганізацыях.

Адукацыйныя стандарты і праграмы распрацоўваюцца, як правіла, выкладчыкамі ўстаноў адукацыі і не ўлічваюць патрэбы рэальнага сектара эканомікі. Работа па іх перагляздзе не завершана, універсітэцкія вучэбныя дапаможнікі і падручнікі, як і школьныя, патрабуюць удасканалення. Ёсць прыклады, калі студэнтаў рыхтуюць па падручніках, выдадзеных яшчэ ў пачатку 90-х гадоў. Вучэбна-метадычны савет павінен больш прынцыпова падыходзіць да адбору рукапісаў выданняў, якія рэкамендуюцца ў якасці вучэбных дапаможнікаў.

Ігар Петрышэнка агучыў вельмі важную і актуальную думку: «Трэба пераходзіць да шматканальнага фінансавання вышэйшай школы. На аснашчэнне лабараторый, фінансаванне навуковых даследаванняў, аказанне мэтавай падтрымкі адораных ці сацыяльна неабароненых студэнтаў, распрацоўку навуковых праектаў неабходна прыцягваць сродкі інвестыцыйных фондаў, спонсараў, развіваць пазабюджэтную дзейнасць».

Асобна намеснік прэм'ер-міністра спыніўся на пабудове лічбавай эканомікі, дзе адукацыі адводзіцца адна з ключавых пазіцый. Ужо некалькі гадоў у краіне рэалізуецца праект «Электронная школа», але толькі чвэрць устаноў адукацыі працуюць з электроннымі дзённікамі і класнымі журналамі. Ёсць пытанне і з напаўненнем электронных адукацыйных рэсурсаў якасным кантэнтам, які б адпавядаў узроставым, псіхалагічным і ідэалагічным крытэрыям. «Не варта забываць, што нашы дзеці з пялюшак жывуць у лічбавым асяроддзі, — дадаў ён, — сістэма адукацыі будзе вымушана шукаць новыя формы ўзаемадзеяння педагогаў з навучэнцамі, укараняць новыя тэхналогіі навучання. І да гэтага трэба быць падрыхтаванымі ўжо сёння».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Кантрольны адлік

## Колькасць праверак КДК у 2018 годзе скарацілася ў два разы

**Мінулы год стаў пераломным у навядзенні парадку ў кантрольнай дзейнасці ў краіне. Кантроль, які не перашкаджае рабоце прадпрыемства, замена традыцыйных праверак маніторынгамі, асаблівая ўвага бюджэтнай сферы, акцэнт на прафілактычную работу — гэта пакладзена ў аснову новага прынцыпу дзейнасці Камітэта дзяржкантролю: надаць ёй чалавечы твар.**

— Сам Камітэт дзяржаўнага кантролю за мінулы год паменшыў колькасць праверак у два разы, пры гэтым вернута ў бюджэт на 16,3 % больш сродкаў чым гадам раней (177 мільёнаў рублёў). Гэта не перашкодзіла нам іншымі метадамі і формамі праводзіць кантрольныя мерапрыемствы, — сказаў **старшыня ведамства Леанід АНФІМАЎ** перад пачаткам калегіі, прысвечанай вынікам работы за 2018 год. — Новыя формы: маніторынгі і аўдыты эфектыўнасці дазволілі сэканоміць і прадухіліць выплаты дзяржаўных сродкаў на суму 260 мільёнаў рублёў.

Значную работу КДК летась праводзіў дзеля выяўлення рэзерваў у энергетыцы, выключэння неабгрунтаванага пасярэдніцтва. Органамі дзяржаўнага кантролю выяўлены недахопы ў арганізацыі харчавання ва ўстановах адукацыі і бальніцах. Як вынік — вызначаны адзіныя гранічныя гандлёвыя надбаўкі і нацэнкі, перагледжаны падыходы да складання меню, скасаваны дагаворы з пасярэднікамі.

Асаблівая ўвага надаецца і праблемам Аршанскага рэгіёна. З удзелам КДК распрацаваны бізнес-планы перспектыўнага развіцця кожнага прадпрыемства. Аднак пачыннанні рэалізуюцца маруднымі тэмпамі.

— На жаль, пачынае спадаць актыўнасць у рэалізацыі тых праграм, якія павінны падняць прамысловы комплекс Аршанскага рэгёна на годны ўзровень, — паведаміў Леанід Анфімаў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Рэха вайны

## МЕСЦА МАСАВАГА ПАХАВАННЯ ЛЮДЗЕЙ ЗНОЙДЗЕНА Ў БРЭСЦЕ

**Вайна не дае пра сябе забываць. Там, куды яна абрынулася 22 чэрвеня 41-га, у Брэсце, зноў знайшлі сляды невядомых ахвяр жудаснай навалы.**

У самым цэнтры горада, у квадраце, абмежаваным кварталамі вуліц Савецкай, Дзяржынскага, Куйбышава і праспекта Машэрава знеслі старыя баракі і пачалі рыхтаваць пляцоўку да ўзвядзення прэміум-квартала. Паводле праекта, тут павінен быў вельмі хутка вырасці чатырохпавярховы дом са шматфункцыянальным комплексам, з пляцоўкамі для адпачынку і паркоўкамі. А калі будаўнікі сталі капаць катлаван, знайшлі чалавечыя астанкі.

На гэтым месцы ў 1941—1942 гадах знаходзілася яўрэйскае гета. Большасць яго вязняў вывезлі і забілі ва ўрочышчы Бронная Гара. Але некаторых, відавочна, расстрэльвалі і тут. Магчыма, людзі паміралі ад хвароб і нястачы. Іх хавалі побач.

На будаўнічую пляцоўку прыбылі байцы 52-га спецыялізаванага пошукавага батальёна. На глыбіні больш за метр пошукавікі знаходзяць рэшткі адзення і абутку, асабістыя рэчы. «Няма сумнення, што гаворка ідзе аб агульнай магіле прадстаўнікоў мірнага насельніцтва. Хоць у архівах звестак аб масавых расстрэлах менавіта ў гэтым месцы не знойдзена», — паведаміла **Ала КОНДАК, вядучы спецыяліст аддзела культуры гарвыканкама.** Але ж архівы — гэта адно, а рэальныя сведчанні-знаходкі — іншае.

Будаўніцтва часова прыпыненае. Інвестар ТАА «Прыбужскі квартал» аказвае спрыянне пошукаваму атраду.

Пакуль вядуцца раскопкі, лёс інвестпраекта вырашаецца. Магчыма, ён будзе скарэктаваны, а магчыма, скасаваны зусім, і на месцы масавага пахавання з'явіцца сквер. У гарвыканкаме пакуль не даюць адназначнага адказу на пытанне. Многае, відавочна, будзе залежаць ад таго, што і ў якой колькасці знойдуць спецыялісты на месцы раскопак.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Спажывец

## Банкет за свой кошт

### Папярэднія заказы ў аб'ектах грамадскага харчавання будуць афармляцца па-новаму

**Адпаведную інструкцыю зацвердзіла Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю. Яна ўступіць у сілу з 21 лютага. Такая інфармацыя з'явілася на Нацыянальным прававым партале.**

Згодна з дакументам, у папярэднім заказе сярод іншага павінны быць прапісаны даты яго заключэння і выканання, інфармацыя пра від паслугі, яе асаблівасці і папярэдні кошт. Работнік мусіць азнаёміць пакупніка з умовамі абслугоўвання ў аб'екце грамадскага харчавання. Заказ афармляецца не пазней чым за дзень да пачатку абслугоўвання і рэгіструецца ў кнізе ўліку папярэдніх заказаў, якая вядзецца прадаўцом у адвольнай форме.

Адмовіцца пакупнік можа ў любы час. Але пры гэтым яму давядзецца заплаціць рэстарану ці кавярні фактычна панесеныя расходы, звязаныя з гэтым.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

## КАРАЕДА КРЫХУ «ПРЫЦІСНУЛІ»

**У студзені плошча ўсыхання ў хваёвых насаджэннях, якія патрабавалі правядзення суцэльных санітарных высечак, склала 2,9 тысячы гектараў, што ў тры разы менш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Такія звесткі агучыў падчас апаратнай нарады першы намеснік міністра лясной гаспадаркі Валянцін Шатраўка.**



Пастаноўка на ўлік і распрацоўка хваёвых насаджэнняў, што ўсыхаюць, сёння ажыццяўляюцца спецыялістамі лесагаспадарчых устаноў своечасова і аператыўна. Гэта, у сваю чаргу, дазваляе стрымліваць тэмпы распаўсюджвання шкоднікаў, цытуе прэс-служба яго словы.

Упершыню ачагі караедных усыханняў хвоі ў Беларусі былі выяўлены ў 2010 годзе на тэрыторыі Гомельскага доследнага лягсаса. Пазней яны распаўсюдзіліся на іншыя паўднёвыя рэгіёны краіны: Гомельскую, Брэсцкую, частку Мінскай і Магілёўскай абласцей. Паступовае павышэнне тэмпературы паветра, зніжэнне ўзроўню грунтовых водаў, засухі на працягу апошніх трох-чатырох гадоў аказалі істотны ўплыў на ўстойлівасць насаджэнняў. Пры гэтым гаворка ідзе не толькі аб лясным фондзе Беларусі, але таксама і аб Расійскай Федэрацыі, Украіне, краінах Еўропы, ЗША, Канады і інш. Гэта гаворыць аб глабальнасці згаданай праблемы.

У 2018 годзе ў выніку правядзення суцэльных санітарных высечак ва ўсыхаючых насаджэннях было нарыхтавана больш за 13 мільёнаў кубічных метраў драўніны. У сувязі з нарастаючымі аб'ёмамі распрацоўкі такіх насаджэнняў Міністэрствам лясной гаспадаркі было прынята рашэнне аб прыпыненні высечак у здаровых масівах.

На думку экспертаў, найбольш эфектыўным і на сёння, па сутнасці, адзіным спосабам паляпшэння санітарнага стану лясоў з'яўляецца своечасовае выяўленне і высечка пашкоджаных насаджэнняў. Іншага спосабу ў практыцы лесаахоўы не існуе ў сувязі з біялагічнай асаблівасцю жука-караеда, які сілкуецца і жыве пад карой.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ДЛЯ ЎСІХ, ХТО ПІША І ЧЫТАЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр Карлюкевіч падзякаваў усім, хто ставіцца да кнігі, паводле Максіма Горкага, «як да жывога факта», і пажадаў кожнаму наведвальніку добрага чытання, добрага настрою — і абавязкова знайсці тую самую, «сваю» кнігу.

Са свайго боку, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец (гэта творчая суполка нароўні з Міністэрствам інфармацыі і Мінгарвыканкамам з'яўляецца адным з арганізатараў мінскай выстаўкі) падкрэсліў, што ў няпростай сітуацыі, якая склалася ў сучасным свеце, пісьменнікі з розных краін абавязаныя ўзаемадзейнічаць і «рабіць усё магчымае, каб на змену дыктату сілы прыйшоў дыктат слова».

Спецыяльны прадстаўнік Прэзідэнта Расіі па міжнародным культурным супрацоўніцтве Міхаіл Швыдкой расказаў, што на расійскім нацыянальным стэндзе плошчай у 200 квадратных метраў сёлета прадстаўлена больш



чым 500 кніг вядучых выдавецтваў, а ў праграме расійскай дэлегацыі — мноства прэзентацый, круглыя сталы з удзелам беларускіх і расійскіх пісьменнікаў, сустрэчы з папулярнымі літаратарамі. «2019 год на прасторы СНД абвешчаны Годам кнігі, і вельмі важна, што менавіта Беларусь адкрывае гэты год, які будзе насычаны падзеямі, прысвечанымі выдавецкай справе, літаратуры нашых краін, а таксама прыемна, што мы запрошаныя быць партнёрамі на гэтым вялікім святе кнігі», — адзначыў Міхаіл Швыдкой. А намеснік кіраўніка Федэральнага агенцтва па друку і масавых камунікацыях РФ Уладзімір Грыгор'еў дадаў, што Беларусь ужо можа лічыць сябе запрошанай на расійскія кніжныя святы — фестываль «Красная площадь», які пройдзе ў чэрвені, і Маскоўскую міжнародную кніжную выстаўку-кірмаш, што збярэ ўдзельнікаў у верасні на ВДНГ, і, дарэчы, прыме Беларусь у якасці цэнтральнага экспанента.

Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор Рапота, знаёмячыся з выстаўкай, адзначыў вялікую колькасць замежных удзельнікаў і шырокі жанравы асартымент кніжных навінак, якія прадстаўлены на выдавецкіх стэндах.

Цікавых падзей на выстаўцы так шмат, што хочацца разарвацца, каб убачыць усё. Так, на цэнтральным нацыянальным стэндзе прадстаўлены аўтарскі праект калекцыянера Уладзіміра Ліхадзедава «У пошуках страчанага»: калекцыя старых паштовак, кніг і фатаграфій, а таксама друкарскія і пісьмовыя прылады канца XIX — пачатку XX стагоддзя, экспазіцыя, прысвечаная ўраджэнцам Беларусі Адаму Міцкевічу і Яну Булгаку; рэканструяваны па старажытных чарцяжах друкарскі станок XVI стагоддзя і створаная з яго дапамогай копія Бібліі Францыска Скарыны... Частку экспанатаў з вялікай калекцыі, якая збіралася цягам больш чым 40 гадоў, Уладзімір Ліхадзедаў, дарэчы, якраз на выстаўцы перадаў у падарунак Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі — у тым ліку існуючыя ў адзіным асобніку падшыўкі «Гродненских губернских ведомостей» (1841 год), а таксама ўнікальныя рукапісныя дакументы XVII—XVIII стагоддзяў з калекцыі Тышкевічаў, якія не інакш як цудам удалося адшукаць і вярнуць на радзіму. У набыцці калекцыі Ліхадзедава, дарэчы, зацікаўлена Бібліятэка Кангрэса ЗША і іншыя замежныя ўстановы, але беларусам пашанцавала больш — дзякуючы супрацоўніцтву прыватніка і дзяржавы частка каштоўных дакументаў трапіць у «рэдкі фонд» Нацыянальнай бібліятэкі і будуць выдавацца на рукі толькі спецыялістам, але ў лічбавым выглядзе, паводле слоў дырэктара бібліятэкі Рамана Матульскага, іх змогуць убачыць усе карыстальнікі. А пакуль што іх можна знайсці на выстаўцы — таксама, як прадстаўлены дзякуючы «Белгазпрамбанку» арыгінал (!) «Малой падарожнай кніжкі» Францыска Скарыны 1522 года выдання і прысвечаны кнізе інтэрактыўны стэнд на рускай і англійскай мовах, экспазіцыю «Беларускі Буквар: чатыры стагоддзі гісторыі» і побач — сучасны праект — перасоўную выстаўку мастацкіх кніг пісьменнікаў дзяржаў — удзельніц СНД «Чытаем разам — спазнаём адзін аднаго»... У апошняй прадстаўлення 56 кніг з дзевяці краін (Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі, Малдовы, Таджыкістана і Туркменістана), якія выйшлі на рускай і нацыянальных мовах за апошнюю чвэрць стагоддзя і сталі знакавымі ў сваіх краінах. «Мы прасілі прадставіць па пяць кніг ад кожнай краіны, але ў выніку іх аказалася значна больш, у агульны лік увайшлі і некалькі твораў аўтараў, якія пісалі ў ранейшы час, але іх кнігі актыўна выдаюцца ў дзяржавах СНД і сёння дзякуючы актуальнасці, асаблівай папулярнасці», — тлумачыць першы намеснік старшыні Выканкама — выканаўчага сакратара СНД Віктар Гумінскі. У Мінску гэта выстаўка, зладжаная сіламі Савета па культурным супрацоўніцтве краін СНД, Выканкама Садружнасці і Прэзідэнцкай бібліятэкі Беларусі, дэманструецца ўпершыню, а надалей будзе прадстаўленая ў вядучых нацыянальных бібліятэках краін Садружнасці.

...Увесь дзень у галоўным павільёне «БелЭкспа» гучалі спевы, вершы і проза на розных мовах. Маленькія наведвальнікі танцавалі пад выступленні беларускіх прадстаўнікоў дзіцячага «Еўрабачання», удзельнічалі ў інтэрактыўных гульнях і віктарынах, захоплена гарталі маляўнічыя кніжкі з карцінкамі, а дарослыя, прызнаючыся, што вочы разбягаюцца, тым не менш знаходзілі сабе літаратуру па душы і пакідалі павільён, як галоўны скарб несучы Яе Вялікасць Кнігу... Акрамя таго, 6 лютага прыняла вялікую колькасць пакупнікоў урачыста адкрытая ў межах ММКВК сталічная кнігарня «Дружба» — на яе паліцах прадстаўлены кнігі розных краін свету, а асалоду чытання тут можна сумясціць з кубачкам кавы ці дэсертам. Ужо адбыліся шматлікія кніжныя прэзентацыі і сустрэчы з аўтарамі, у тым ліку на стэндзе Выдавецкага дома «Звязда», прайшлі некаторыя культурна-асветніцкія праграмы ў бібліятэках і кінапаказы паводле вядомых кніг. Пакаштавалі «кніжных прысмакаў», прыгатаваных паводле апісанняў у літаратурных бестселерах, госці адмысловага гастратыдня, які працягнецца ў многіх кавярнях і рэстаранах Мінска да 10 лютага. Але напярэдадні яшчэ шмат цікавага, таму, калі вы любіце чытаць, — не праходзьце міма Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу!



**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Андрэя САЗОНАВА.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ЦЭНЫ ПРЫЙДЗЕЦЦА ЗЛЁГКУ АДПУСЦІЦЬ

**Прынамсі, на працягу першых месяцаў года**

**Як вядома, сёлета плануецца ўтрымаць інфляцыю ў межах 5 % гадавых. Гэтую задачу ніхто не адмяняў, але... Згаданы паказчык у першым паўгоддзі гэтага года прагназуецца рэгулятарам ужо вышэй запланаванага — на ўзроўні 2018 года, заявіў учора на брыфінгу журналістам старшыня праўлення Нацыянальнага банка Павел КАЛАУР.**

«Паводле ацэнак, інфляцыя ў першай палове года будзе перавышаць усталяваны на 2019 год мэтавы параметр па інфляцыі. Гэта звязана з тым, што негатыўны ціск з боку ўжо дзеючых часовых фактараў не знікне ў адно імгненне. Хоць паступова іх ўздзеянне будзе згасаць», — сказаў Павел Калаур. Адказваючы на пытанні журналістаў, ён адзначыў, што інфляцыя ў гэты перыяд можа быць «паблізу ўзроўню, які быў летась, з нейкімі нязначнымі адхіленнямі (крыху вышэй або крыху ніжэй). Інфляцыя па мінулым годзе склала 5,6 %, гэта значыць у першым паўгоддзі яна можа быць і 5,5 %, і 5,8 %», — сказаў старшыня праўлення Нацбанка.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ПАД ЗНАКАМ СЭРЦА

**У Брэсце зацверджаны лагатып культурнай сталіцы СНД**

**Калі Пінск стаў сёлета культурнай сталіцай Беларусі, то Брэст аб'яўлены культурнай сталіцай Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Афіцыйная цырымонія надання статусу сталіцы адбудзецца ў красавіку. Тады Брэст прыме майстроў мастацтваў з дзяржаў — удзельніц СНД, пройдуць канцэрты і выстаўкі.**

А на год запланаваны шэраг міжнародных мерапрыемстваў. У іх ліку — конкурс піяністаў, харэаграфічны фестываль, фестываль Дружбы, пасяджэнне бібліятэчнай асамблеі Еўразіі. І кожную імпрэзу будзе суправаджаць эмблема — лагатып культурнай сталіцы. Яна з'явіцца на вуліцах горада, на друкаванай і сувенірнай прадукцыі. Пасля правядзення конкурсу на найлепшую эмблему варыянт творчага калектыву ў складзе Уладзіміра Грыштука і Уладзіміра Любчука быў зацверджаны. Паводле слоў аўтараў, яны зашыфравалі ў лагатыпе знак сэрца, чалавека, сонца і кветкі, а яго цэнтральнай часткай выступае герб Брэста.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## БРАЛІ І КОЛЬКАСЦЮ, І ВАГОЙ

**Нелегалаў з сеткамі і дзясяткамі кілаграмаў рыбы затрымалі ў Гродне і Жлобінскім раёне.**

Два гродзенцы на возеры Рыбніца, размешчаным за 15 кіламетраў ад абласнога цэнтра, злавілі сеткамі 136 кілаграмаў адборнай рыбы — кожная асобіна (134 ляшчы і два судакі) важыла ў сярэднім па кілаграме.

Машыну браканьераў інспектары разам з супрацоўнікамі міліцыі затрымалі ў Гродне, у багажніку аўто ляжалі два мяхі з уловам і дзве сеткі даўжынёй 100 метраў.



Адзін з затрыманых добра знаёмы мясцовым інспектарам: мужчыну некалькі разоў прыцягвалі да адказнасці за незаконнае рыбалоўства і гандаль рыбай. Цяпер у дачыненні да іх заведзена крымінальная справа. Сваю віну абодва прызналі, парушальнікам трэба будзе выплаціць 10,5 тысячы рублёў у якасці кампенсацыі нанесенай прыродзе шкоды. На аўтамабіль накладзены арышт, паведамілі ў Дзяржінспекцыі.

У Жлобінскім раёне на затоцы возера Вярэнскага двое мясцовых жыхароў рыбачылі забароненымі прыладамі — устанавілі ў ваду дзесяць рыбалоўных сетак і два экраны з таго ж матэрыялу. З іх дапамогай ім удалося злавіць 309 асобін (у асноўным плоткі і акуня) агульнай вагой 36 кілаграмаў. Прычыненая шкода, з прычыны вялікай колькасці рыбы, ацэньваецца ў 7,9 тысячы рублёў. Заведзена крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
7 ЛЮТАГА 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 3 (15858)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года



Імёны

## Дзмітрый НІКАНОВІЧ:

# «Стрымліваю ў сабе авантурызм»

**Ён — малады выкладчык, журналіст і спявак. Пра такіх кажуць: таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім. З дзяцінства пачаў займацца вакалам, іграў у школьным тэатры, перамагаў на рэспубліканскіх алімпіядах па мове і літаратуры. Паступіў на факультэт журналістыкі БДУ — і завярцелася: стажыроўкі ў вядучых друкаваных выданнях краіны, на вядомых радыё- і тэлеканалах, навучанне па журналісцкіх праграмах у Швецыі і Італіі, заканчэнне магістратуры. Зараз Дзмітрыю 25 гадоў. У вольны час ён прысвячае сябе музычнай творчасці, але галоўнай дзейнасцю ўсё ж лічыць навуковую, піша кандыдацкую дысертацыю. Пра тое, як прадукцыйна працаваць і жыць у задавальненне, суразмоўнік і расказаў нам у інтэрв'ю.**

***— Дзмітрый, вы выглядаеце занадта сур'ёзна і арганізавана для сваіх гадоў. Так было заўсёды?***

— Мне бацькі з дзяцінства казалі, што я дарослы не па гадах. Летам замест футбола і хованак вучыўся пісаць пропіссю літары, седзячы на балконе з адчыненымі вокнамі, — для натхнення на прыгожы почырк. У мяне амаль не было вольнага часу для бадзяння па двары ў шумнай кампаніі. Ды і жадання такога не было: падабалася чытаць кнігі, глядзець яркія сюжэты па тэлебачанні, спяваць, вучыць вершы. Не шкадую, што дзяцінства было менавіта такім, бо строгасць бацькоў і добрае выхаванне сфарміравалі ўпартасць, адказнасць за тое, што раблю.

***— Чаму выбралі журналістыку?***

— Шчыра кажучы, доўга не мог вызначыцца, бо атрымлівалася многае. З юнага ўзросту пачаў займацца вакалам, спяваць у музычным гурце, у хоры, хадзіць у музычную школу. Ужо ў 11 гадоў выступіў на тэлевізійным шоу «Сузор'е надзей». І ў сілу рамантычнасці сваёй натуры вырашыў прысвяціць сябе акадэмічнай музыцы: рыхтаваўся да паступлення ў музычны каледж, займаўся па спецыяльнай праграме з рэпетытарам. Але бацькі ў выніку не падтрымалі і настаялі на «больш сур'ёзнай» адукацыі. Было зразумела, што фізікам наўрад ці стану — вось і выбраў журфак і ніколькі не пашкадаваў пра гэта.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Прэч стэрэатыпы!

# ДАКЛАДНЫЯ НАВУКІ — НЕ ДЛЯ ДЗЯЎЧАТ?

## А вы абудзіце ў іх храбрасць і цікавасць да вучэбна-даследчай дзейнасці!

*«20 гадоў таму жанчыны маглі быць сакратарамі, школьнымі настаўніцамі, магчыма, бібліятэкарамі, сацыяльнымі работнікамі ці медсёстрамі. Калі жанчына была насамрэч амбіцыйнай, то магла скласці канкурэнцыю мужчынам... звычайна працуючы больш упарта і больш працяглы час з меншай аплатай за тую ж самую працу. Але зараз з'явіліся асляпляльныя перспектывы і цалкам новы від работы для жанчын — праграмаванне...»* Артыкул The Computer Girls («Камп'ютарныя дзяўчаты») з'явіўся ў выпуску часопіса Cosmopolitan за 1967 год.



У тыя часы праграмаванне яшчэ не лічылася інжынернай або навуковай прафесіяй, і часта многія курсы па Computer Science выкладаліся ў рознапрофільных каледжах і ўніверсітэтах, уключаючы ўстановы гуманітарнай і артнакіраванасці, у якіх вучыліся тады пераважна дзяўчаты. У сярэдзіне шасцідзясятых гадоў XX стагоддзя праграмаванне пазіцыянавалася ў медыя як «жаночая праца». Жанчыны пачалі запаўняць IT-індустрыю, калі мужчыны ўжо дамінавалі ў тэхнічных спецыяльнасцях, але не так відавочна, як у свеце камп'ютарных вылічэнняў. Яшчэ ў 1987 годзе 42 % стваральнікаў праграмнага забеспячэння ў Амерыцы былі жанчынамі. 34 % сістэмных аналітыкаў таксама належалі да прыгожага полу. А потым сітуацыя змянілася...

Паводле даследаванняў 2015 года папулярнага рэсурсу StackOverflow, 92 % усіх распрацоўшчыкаў у свеце — мужчыны. Дзесьці гэты працэнт значна ніжэйшы, у прыватнасці, у Facebook 17 % тэхнічных пасад займаюць жанчыны, але на агульную карціну гэта не ўплывае...

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Пазнаёміцца з прафесіяй

# «Магу пераблытаць людзей, а дэльфінаў — ніколі!»,

## ці Як становяцца дрэсіроўшчыкамі гэтых жывёл

**«Мы з табой адной крыві» — менавіта такі дэвіз выкарыстоўвае і ў жыцці, і на працы Яўген ФІШЧУК. Ужо дзевяць гадоў ён займаецца выхаваннем дэльфінаў і іншых млекакормячых. Работа ў дэльфінарыі «Нэма» для яго не толькі спосаб заробку, але і хобі, і нават сям'я.**



***— Дрэсіроўшчык дэльфінаў — даволі рэдкая прафесія. Як вы трапілі ў яе?***

— Зусім выпадкова. У мяне ў жыцці ўсё было распланавана гадоў на трыццаць наперад. І тут я неяк схадзіў у дэльфінарый. На наступны дзень кінуў сваю ранейшую работу, з'явіўся ў дэльфінарыі і сказаў: «Я прыйшоў да вас». Вядома, да мяне спачатку сур'ёзна ніхто не ставіўся, таму прыйшлося даказваць, што я ім патрэбны.

У мяне дзве адукацыі, але ні адна не мае нічога агульнага з дэльфінамі. Першая была музычная, другая аграрная — жывёлавод-селекцыянер. Усе здзейсніліся, калі я пайшоў са «служыцеляў муз» у жывёлаводы. А ў выніку знайшоў месца, дзе ў мяне ёсць і сцэна, і жывёлы.

***— Як знаходзілі агульную мову з падапечнымі?***

— У мяне ў «падпарадкаванні» ёсць дэльфіны, марскі коцік, марскі леў. Каб знайсці агульную мову, для пачатку трэба тры разы прачытаць «Маўглі» Рэд'ярда Кіплінга, вывучыць фразу «мы з табой адной крыві», тады кантакт наладзіць будзе значна лягчэй.

***— Дэльфіны ж не чуюць голасу...***

— У кожнага трэнера ёсць свісток, яго жывёлы чуюць нават пад вадой. Таксама дэльфіны выдатна разумеюць жэсты. Калі трэба паказаць ім нейкае месца ў прасторы, мы выкарыстоўваем доўгі шост. У астатнім метады стасункаў — гэта прафесійны сакрэт, які перадаецца ад трэнера да вучня.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

# ДАКЛАДНЫЯ НАВУКІ — НЕ ДЛЯ ДЗЯЎЧАТ?

## РЫЗЫКА І «САЦЫЯЛЬНЫ КАНТРАКТ»

Некалькі гадоў таму ў Мінску адкрылася Акадэмія крэатыўных тэхналогій для дзяўчат (IT Princess Academy). Праект прасоўвае ідэю жаночай тэхнічнай адукацыі. Узрост «прынцэс» — ад 7 да 15 гадоў.

— Ідэю мог падхапіць любы, проста мы былі першыя, хто вырашыў звязаць дзяўчат і IT, — расказвае **Валянціна ЧЭКАН, сузаснавальнік IT Princess Academy і STEM-school.** — Яны ў тэхналогіях могуць дасягнуць таго, што не пад сілу хлопчыкам, і гісторыя IT-сферы гэта даказвае.

Дарэчы, у Вялікабрытаніі, Канадзе, Аўстраліі, ЗША і іншых краінах навучальныя ўстановы з асобным навучаннем вельмі прэстыжныя. Заўважана, што хлопцы і дзяўчаты па-рознаму засвойваюць вучэбны матэрыял, а звычайная школа заахвочвае «мужчынскі» тып паводзін, фарміруючы стэрэатып: дакладныя навукі і высокатэхналагічныя галіны — не для дзяўчат.

— Педагогі ведаюць, што ў дзіцячым садку і пачатковай школе розніца паміж хлопчыкамі і дзяўчаткамі яшчэ мала заўважная. Але ўжо ў пятым, шостым, сёмым класах яна становіцца відавочнай. У пятым класе хлочыкі вучацца толькі за кошт увагі з боку бацькоў, у іх няма ніякіх амбіцый, а дзяўчаты, наадварот, вырываюцца наперад. Схільнасць да камунікацыі, уцягнутасць у любую дзейнасць, жаданне быць заўважанымі, як і хуткасць засваення вучэбнага матэрыялу, у раннім падлеткавым узросце ў дзяўчат намнога вышэйшыя. Даказана, што нават тэмпература ў пакоі, дзе вучацца школьніцы, павінна быць больш высокая, а хлопчыкам падыходзяць халаднаватыя памяшканні, — тлумачыць Валянціна Чэкан.

У 8—9-м класах у хлопчыкаў абуджаюцца амбіцыі. Іх матывуюць розныя рэйтынгі, «пагоны» і «зорачкі», а з дзяўчатамі ўсё адбываецца наадварот. Яны пазбягаюць канкурэнцыі і саперніцтва і не рызыкуюць у загадзя пройгрышнай сітуацыі. Чаму жанчын мала сярод прадпрымальнікаў? А таму, што яны не жадаюць рызыкаваць. Храбрасць, імкненне да рызыкі ў дзяўчат трэба выхоўваць.

**«Праграмаваць — не складаней, чым планаваць вячэру».**

«Які сэнс укладвае наша грамадства ў паняцце «добрая дзяўчынка»? Яна ўсё робіць па правілах, паслухмяная дачка, якая не дастаўляе нязручнасцяў ні бацькам, ні соцыуму, — разважае Валянціна Чэкан. — Я добра ведаю гэта, бо я таксама дачка і маці дачкі. Паміж намі і грамадствам ёсць «сацыяльны кантракт», і калі ты хочаш быць добрай дзяўчынкай, то, калі ласка, яго выконвай. Дзяўчынка-падлетак вельмі рана гэты кантракт «прачытвае», і калі мы прапануем: «А давай зробім па-іншаму...», то чуем у адказ катэгарычнае: «А дзеля чаго я буду рызыкаваць?» Так, рызыка мае на ўвазе высокую верагоднасць памылкі, значыць, ты аўтаматычна трапляеш у зону небяспекі! І што ўзамен? А калі дзяўчынка яшчэ і добра вучыцца ці ўвогуле выдатніца... Вось мы і задумаліся, як абудзіць у дзяўчат цікавасць да вучэбна-даследчай дзейнасці, да таго, што ў нас традыцыйна лічыцца тэрыторыяй мужчынскіх інтарэсаў? Як развіць у іх крэатыўнасць?

— Калі адкрывалі акадэмію, арганізавалі вялікую канферэнцыю, запрасіўшы на сустрэчу з дзяўчатамі прадстаўнікоў ПВТ. Выйшаў топ-менеджар кампаніі Wargaming, яркі малады чалавек, які расказваў ім пра фізіку, пра важнасць гэтай дысцыпліны для стварэння праўдападобных гульняў, але на тварах дзяўчат я выразна прачытала: «Ты бог, усё супер, але дзе ты, а дзе я?» — расказвае Валянціна Чэкан. — А вось калі на сцэну выйшла звычайная дзяўчына Юля ў кедах, джынсах і футболцы, якая таксама працуе ў ПВТ, у зале адразу ўзнікла ажыўленне. Да яе было шмат пытанняў. 11-гадовую дзяўчынку цікавіла, напрыклад, колькі ў Юлі дзяцей. Высветлілася, што двое. Адказ задаволіў, таму што школьніца хацела б займацца праграмаваннем, але і дзяцей, сям'ю таксама хоча мець. І яна атрымала красамоўны доказ, што адно другому — не перашкода. «У дзяўчыны з ПВТ такія ж валасы, такія ж джынсы, кеды, усё ў нас у прынцыпе аднолькавае, але яна ўжо там, а я туды абавязкова прыйду», — прыкладна так яна разважала. Таму матывацыйны складнік для дзяўчат мы лічым вельмі важным.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

## ЯНЫ БЫЛІ ПЕРШЫМІ...

Звычайна на просьбу назваць вядомых айцішнікаў дзяўчаты згадваюць Стывена Джобса, Марка Цукерберга, Паўла Дурава, нават хлопчыкі называюць максімум шэсцьсем прозвішчаў. Але IT-індустрыя распачалася менавіта з жанчын. Хоць уклад многіх з іх быў доўгі час засакрэчаным.



**За з'яўленне спадарожнікавай сувязі, Wi-Fi, Bluetooth і стандарту GSM мы павінны сказаць «дзякуй» галівудскай актрысе Хэдзі Ламар.**

Між іншым, **дачка паэта Байрана Ада ЛАЎЛЕЙС** лічыцца першым у гісторыі праграмістам. Яна апісала прынцыпы работы першага ў свеце «камп'ютара» (аналітычнай машыны), напісала праграмы, якія ніхто з яе сучаснікаў не зразумеў, але пазней менавіта яны ляглі ў аснову першых кодаў для ЭВМ. Ада Лаўлейс увяла ў абарачэнне тэрміны «цыкл», «рабочая ячэйка», «размеркавальная карта», апісала асноўныя прынцыпы алгарытмізацыі.

«Сутнасць і прызначэнне машыны будуць змяняцца ў залежнасці ад таго, якую інфармацыю мы ў яе ўкладзём. Машына зможа пісаць музыку, маляваць карціны і пакажа навуцы такія шляхі, якія нам і не сніліся», — пісала Ада Лаўлейс яшчэ ў першай палове XIX стагоддзя. А ў 1979 годзе Міністэрства абароны ЗША распрацавала агульную мову праграмавання для бартавых сістэм кіравання ваеннымі аб'ектамі, якая атрымала назву «Ада» ў гонар Ады Лаўлейс.

Яшчэ адна выбітная асоба — **Хэдзі ЛАМАР**. Яе дзень нараджэння сёння адзначаецца як Дзень вынаходніка. Вельмі папулярная ў 1930-я гады аўстрыйская актрыса яўрэйскага паходжання збягае ў Амерыку, у тым ліку і ад свайго мужа — аднаго з найбагацейшых прамыслоўцаў, мільянера і гандляра зброяй. У Галівудзе кар'ера актрысы таксама складваецца ўдала. Але Хэдзі прымае вельмі блізка да сэрца ўсё, што адбываецца ў яе на радзіме. Яна ненавідзіць фашызм усёй душой. Таму, калі ў рамках мер па ўмацаванні абараназдольнасці ў ЗША ствараецца Нацыянальны савет вынаходнікаў, яна неадкладна вырашае прапанаваць свае паслугі.



**Ада Лаўлейс увяла ў абарачэнне тэрміны «цыкл», «рабочая ячэйка», «размеркавальная карта», апісала асноўныя прынцыпы алгарытмізацыі, напісала першую праграму для прататыпа камп'ютара.**

Хэдзі ведала, як працуюць радыёкіраваныя тарпеды, самым вялікім недахопам якіх была недасканалая сістэма навядзення: выявіўшы пагрозу, праціўнік лёгка глушыў сігнал, адпраўляючы перашкоды на той жа частаце. Хэдзі прапанавала разбіць сігнал на некалькі частак і перадаваць яго на розных частотах, што зрабіла б сістэму ўстойлівай да перашкод. Тэхнічна гэтую ідэю рэалізаваў кампазітар Антэйл, які прапанаваў выкарыстаць валік механічнага піяніна. Мікраэлектронікі тады яшчэ не было, а адзінай даступнай праграмаванай прыладай было якраз звычайнае фартэпіяна! Яго механізм аказаўся досыць кампактным, каб змясціцца ў корпусе марской тарпеды. Сістэма магла выкарыстоўваць набор з васьмідзесяці васьмі радыёчастот — па колькасці клавіш інструмента. У жніўні 1942 года патэнт на «Сістэму сакрэтных паведамленняў» быў нарэшце атрыманы. Прычым актрыса і кампазітар перадалі яго краіне бязвыплатна.

На жаль, вынаходства занадта моцна апярэдзіла свой час. Многія чыноўнікі нават не змаглі зразумець яго сутнасць і насмешліва ўсклікалі: «Гэтая жанчына прапануе засунуць піяніна ў тарпеду?» Канцэпцыя пераскоку частот адрадзілася толькі з развіццём электронікі пасля вайны. У васьмідзясятых патэнт нарэшце рассакрэцілі, тэхналогію сталі выкарыстоўваць для многіх відаў бесправадной перадачы і сотавых тэлефонаў ва ўсім свеце. Такім чынам, за з'яўленне спадарожнікавай сувязі, Wi-Fi, Bluetooth і стандарту GSM мы павінны сказаць «дзякуй» менавіта галівудскай актрысе і кампазітару.

Яшчэ адзін з піянераў праграмавання — **Грэйс ХОПЕР — амерыканскі матэматык і контр-адмірал флоту ЗША**. Яна была адной з першых, хто пісаў праграмы для гарвардскага камп'ютара «Марк I». Грэйс распрацавала першы кампілятар для камп'ютарнай мовы праграмавання, выявіла першы ў свеце «баг» (праграмную памылку) і стала аўтарам тэрміна debugging, яна мае шматлікія ўзнагароды за неацэнны ўклад у развіццё мовы праграмавання COBOL (яе празвалі «бабуляй Кобала»). Кажуць, што менавіта ёй належаць словы «праграмаваць — не складаней, чым планаваць вячэру».

А **«маці» смартфонаў і планшэтаў лічыцца Сафі УІЛСАН**. За 35 гадоў сваёй кар'еры яна атрымала 59 (!) патэнтаў. Сафі працавала над стварэннем першых камерцыйна паспяховых персанальных камп'ютараў і арыгінальнага ARM-працэсара, нашчадкі якога ў цяперашні час змяшчаюцца ўнутры большасці мабільных прылад.

## МАТЭМАТЫКА І ФІЗІКА + ТВОРЧАСЦЬ

— Як я ўжо казала, для дзяўчат вельмі важныя матывацыйныя гісторыі, прыклады таго, што хтосьці не пабаяўся парушыць «сацыяльны кантракт» і рызыкаваць, — падкрэслівае Валянціна Чэкан. — Калі нашы выхаванкі знаходзяцца адасоблена ад хлопчыкаў, ствараецца абсалютна бяспечнае і камфортнае асяроддзе: яны не канкурыруюць за ўвагу навакольных, не саромеюцца задаваць пытанні, не баяцца памыляцца. Расце іх працаздольнасць — можна «прайсці» больш, падрабязна разабрацць складаныя тэмы. Ва ўмовах сепаратнага навучання дзяўчаты становяцца больш упэўненымі ў сабе, у іх павышаецца самаацэнка, фарміруюцца лідарскія якасці. У акадэміі выкарыстоўваецца новы падыход да напаўнення навучальнага плана (навука, тэхналогіі, інжынерыя, матэматыка плюс мастацтва). Ён ставрае баланс паміж творчым пачаткам і тэхналагічным, тым самым палягчае вывучэнне тэхнічных дысцыплін.

**«Храбрасць, імкненне да рызыкі ў дзяўчат трэба выхоўваць».**

Матэматыка, фізіка выкладаюцца праз мастацтва, дызайн, музыку і іншыя цікавыя рэчы. Упор робіцца на ўласныя праекты. Можна, напрыклад, стварыць калекцыю моды (фэшн-калекцыю), 3D-гульню, запусціць відэаблог, запісаць музычны трэк, асвоіць фотарэтуш. Праграма дазваляе развівацца адначасова па 16 прафесійных напрамках у галіне тэхналогій, дызайну, музыкі, медыя... Важны раздзел праграмы — навыкі для жыцця: работа ў камандзе, камунікатыўнасць, стварэнне стылю, іміджу, крытычнае і крэатыўнае мысленне. Апошняе — вельмі карысны інструмент для жыцця і працы, які дапамагае знаходзіць нестандартныя рашэнні нават у самых складаных сітуацыях. У Акадэміі студэнткі практычна кожны дзень сутыкаюцца з задачамі, якія накіраваны на развіццё крэатыўнага мыслення.

Пакуль што як у буйных, так і ў малых IT-кампаніях жанчыны — у меншасці. Тым, хто плануе звязаць сваю кар'еру з IT, спецыялісты раяць не ісці лёгкім шляхам. Калі дзяўчаты хочуць у IT, яны часцей за ўсё штурмуюць пасады HR (кадравага работніка), адміністратара ці ідуць у тэсціраванне праграмнага забеспячэння. Але там канкурэнцыя ўжо і так высокая. Варта глядзець шырэй: можна выбраць дызайн, маркетынг або аналітыку. Свет не стаіць на месцы: слабы пол даўно не саступае дужаму ні ў адукацыі, ні ў прафесійнай кампетэнцыі. Магчыма, што ўжо праз 5—10 гадоў ніхто і не ўспомніць, што галіна IT была калісьці «не для дзяўчат»... Між іншым, **тры найбольш важныя патрабаванні да праграміста за межамі сферы ведаў — гэта шматзадачнасць, добрая памяць і ўстойлівасць да стрэсаў.** Па ўсіх гэтых крытэрыях мужчыны не могуць скласці слабаму полу канкурэнцыю...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*У ліку найлепшых*

# АКТЫЎНЫМ І ІНІЦЫЯТЫЎНЫМ — ПРЭМІІ «ЗА СПРАВУ»

**Тыя, хто займаецца дабрачыннасцю, звычайна не шукаюць матэрыяльных выгад. Яны атрымліваюць нашмат больш — удзячнасць іншых. Заахвочванне — толькі бонус, хоць і прыемны. Дваццаць пяць актывістаў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі па выніках Года малой радзімы атрымалі прэмію «За справу», заснаваную Мінскім гарадскім камітэтам БРСМ. Сярод іх — трэцякурсніца Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Вікторыя ЛЮБАМІРАВА і трэцякурснік Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Ілья САКАЛОЎ.**

Хлопец — камандзір маладзёжнага атрада ахovы правапарадку і добраахвотнай дружыны «БАРС» сваёй ВНУ.

Яго атрад разам з супрацоўнікамі патрульна-паставой службы міліцыі ўдзельнічае ў сезонных дзяжурствах. Летам ходзяць на вадаёмы, спартыўныя пляцоўкі, у парکі, дзе папярэджваюць людзей пра небяспеку, тлумачаць правілы паводзін, нагадваюць, што трэба сачыць за дзецьмі. У пачатку і ў канцы зімы — расказваюць рыбакам і іншым аматарам адпачынку на прыродзе, што на тонкі лёд выходзіць небяспечна. Таксама ў абавязкі атрада ўваходзіць дзяжурства ў метрапалітэне.

— Мы заўсёды ў адметным адзенні, — гаворыць Ілья, — таму многія ўжо ведаюць нас. Ці бываюць здарэнні падчас дзяжурстваў? Вядома. Напрыклад, на памяці выпадак, калі ў аддзяленне прывялі жанчыну ў стане наркатычнага ап'янення. Яна паводзіла сябе жудасна, казала жахлівыя рэчы. Думаю, што гэта той самы жывы прыклад, як наркотыкі ўздзейнічаюць на людзей...

Ілья працуе і ў дружыне ўніверсітэта. Сярод абавязкаў — падтрыманне парадку ў актавай зале, якая разлічана на восемсот чалавек.

— Там даволі вузкія праходы, — тлумачыць хлопец. — Ёсць рызыка, што пры масавым выхадзе людзей хтосьці паваліцца. Кантралюем, каб, не дай божа, нічога не здарылася. Упэўнены, што хлопцы сарыентуюцца і дапамогуць у любой сітуацыі, нават пры пажары... Мы вучымся самі і праводзім для іншых міні-лекцыі, як сябе паводзіць пры здарэннях. А як самаабараняцца, нам паказвае ва ўніверсітэце майстар спорту па тэхвандо.

Ілья арганізоўвае работу астатніх: праводзіць гутаркі, зборы, перадае назапашаныя веды.



Ілья Сакалоў *(чацвёрты злева)* з камандай.




Вікторыя Любамірава з Уладзімірам Дубіцкім.

— Які камандзір, такая і каманда, — перакананы ён. — Мы заўсёды стараемся адзін аднаму дапамагчы. Для мяне гэта карысны досвед. Цудоўна разумею, што ён дапаможа ў жыцці пасля заканчэння ўніверсітэта.

...Вікторыя — намеснік сакратара ўніверсітэцкай арганізацыі БРСМ, камандзір атрада «Добрае Сэрца», старшыня студэнцкага савета на факультэце.

— Вельмі ўдзячная свайму сябру Уладу Дубіцкаму — сакратару нашай маладзёжнай арганізацыі, — кажа дзяўчына. — Менавіта ён і прывёў мяне сюды на другім курсе. Спачатку паклікаў на адно з мерапрыемстваў, дапамагчы. Калі зразумеў, што ў мяне атрымліваецца, пачаў запрашаць далей. А потым я стала яго намеснікам і цяпер усіх таксама клічу-клічу-клічу.

Разам з іншымі сябрамі БРСМ Віка апякуецца над удзельнікамі конкурсаў «Студэнт года» і «Каралеўская вясна».

— Дапамагаем ім з музыкай, пастаноўкамі: нездарма ж вучымся ва ўніверсітэце культуры і мастацтваў, — расказвае дзяўчына. — Прыходзім на ўсе рэпетыцыі, сустрэчы. Нам давяраюць, з намі раяцца...

Здараецца, што хлопцы і дзяўчаты прапаноўваюць свае ідэі для мерапрыемстваў. А яшчэ — арганізоўваюць дабрачынныя канцэрты. Тэлефануюць «зоркам» беларускай эстрады, кажуць імя таго, каму збіраюць грошы і для чаго. Шмат хто згаджаецца: акцыі ўжо падтрымалі Аляксей Грос, Аляксандр Саладуха, гурт ByCity...

Падчас падобных мерапрыемстваў, як кажа Віка, актывісты больш працуюць за кулісамі. А вось у атрадзе «Добрае Сэрца» яны выконваюць ужо галоўныя ролі. Напрыклад, падчас акцыі «Цуды на Раство» каманда пераапранаецца ў казачных герояў і паказвае сваю навагоднюю праграму ў дзіцячых дамах, шматдзетным і праблемным сем'ям.

— Як студэнтам творчай ВНУ, нам няцяжка штосьці прыдумаць, — кажа Вікторыя. — Часам бяром нейкія нумары з універсітэцкіх мерапрыемстваў. Для дзяцей стараемся не проста «адпрацаваць» праграму, але і пагуляць з імі. Хтосьці робіць малым прычоскі, мадэлюе паветраныя шары ў выглядзе сабачкі ці кветачкі і паказвае, як гэта зрабіць. Ёсць тыя, хто прыдумляе і праводзіць квэсты.

Я звычайна надзяваю касцюм Снягуркі. Разам з Дзедам Марозам мы запрашаем дзяцей спяваць, танцаваць, вадзіць карагоды. Гэта так здорава і весела, мы атрымліваем неверагодныя эмоцыі! Дзеці нас абдымаюць, расказваюць свае сакрэты, кажуць «дзякуй».

Без Вікторыі і яе каманды не абышлася і падрыхтоўка да адкрыцця рэканструяванага сталічнага стадыёна «Дынама». Амаль штодня яны прыходзілі туды: мылі, фарбавалі, выносілі смецце... А яшчэ Віка ўдзельнічала ў акцыі «Аднаўленне святынь Беларусі».

— У фінале ў храме-помніку ў гонар Усіх Святых мы прыбіралі тэрыторыю, чысцілі, грэблі, садзілі дрэвы, — успамінае яна. — А напрыканцы — заклалі адмысловую капсулу ў сцяну...

Вікторыя шчыра прызнаецца, што сумяшчаць вучобу і грамадскую працу няпроста. Даводзіцца ахвяраваць вольным часам і нават сном. Аднак дзяўчына аб гэтым не шкадуе:

— У нас — самая лепшая каманда, — кажа яна. — Нягледзячы на тое, што бываюць і спрэчкі, і несупадзенні ў поглядах, заўсёды прыходзім да кампрамісу. А пасля напружаных дзён, бяссонных начэй разам адпачываем: ездзім на квэсты, у аквапарк, проста гуляем. Таксама разам вандруем за мяжой. Пабывалі ўжо ў Егіпце, Празе, Парыжы, Берліне, Амстэрдаме...

**Юлія АДАМОВІЧ,**
**студэнтка IV курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Медыяджунглі*

# ЛАВІ ФЭЙК!

**Ад сённяшняга спажыўца навін патрабуецца ўменне не толькі чытаць, але і аналізаваць іх, наяўнасць своеасаблівага ўнутранага фільтра, які дазваляе рабіць правільныя высновы наконт надзейнасці крыніцы інфармацыі. Устаноўлена, што чалавекам, які праводзіць асноўную частку жыцця ў віртуальнай прасторы, значна прасцей маніпуляваць. З экранаў мы атрымліваем толькі мноства слаба звязаных паміж сабой фактаў, у нас адключаецца логіка, губляецца прычынна-выніковая сувязь. Псіхолагі нават увялі такое паняцце, як віртуальная калектыўная свядомасць. Інтэрнэт-аўдыторыя з гатоўнасцю «праглынае» ананімныя фэйкавыя паведамленні. Дарэчы, як сведчаць даследаванні, 78 % людзей цалкам давяраюць сваім кантактам у сацыяльных сетках і той інфармацыі, што яны распаўсюджваюць.**

Асновы медыяадукацыі ўжо не першы год укараняюцца ў рамках розных вучэбных прадметаў у беларускіх школах. Магчыма, самы час падзяліцца сваімі ведамі з іншымі? Таварыства беларускай школы прапаноўвае падлеткам і школьным медыя паўдзельнічаць у конкурсе «Лаві фэйк!».

«Ты бачыш, што людзі вакол цябе сутыкаюцца з праблемамі, гледзячы тэлевізар ці блукаючы ў інтэрнэце, і ведаеш, як ім дапамагчы? Твой медыяпраект, магчыма, дапаможа тым, хто некрытычна ўспрымае ўсё, што кажуць з экрана; не ўмее адрозніць факты ад меркаванняў; трапляе пад уплыў рэкламных хітрыкаў; не разумее, што трэба абараняць свае персанальныя даныя; не можа даць рады інтэрнэт-тролям ці тым, хто ў сацыяльных сетках здзекуецца з іншых...

Прапануем табе паспрабаваць свае сілы ў ролі медыямэйкера і мэдыяэксперта! Выкажы сваё меркаванне ў любым медыйным жанры на тэму «Быць медыяпісьменным — гэта проста!»

Раскажы аб праблеме, з якой сутыкаюцца твае сябры, аднакласнікі, настаўнікі, бацькі, бабулі-дзядулі ці суседзі, калі глядзяць тэлепраграмы, фільмы, серыялы, чытаюць вэб-сайты ці «сядзяць» у сацыяльных сетках. Пакажы, як гэтую праблему можна было б вырашыць.

Конкурс прадугледжвае наступныя намінацыі:

1. **Мультымедыя —** аўдыё ці відэа: кліп, міні-фільм (не даўжэйшы за сем хвілін), анімацыя, навучальны відэаролік, падкаст, тэле- ці радыёперадача для школьнага тэлебачання і г. д.
2. **Графічныя і інтэрактыўныя медыя:** інфаграфіка, фота і фотарэпартаж, плакат, комікс, гульня, квіз і г. д.
3. **Тэкставыя медыя:** лонгрыд, блог, пост (група ці старонка) у сацыяльнай сетцы, артыкул у школьнай прэсе, журналісцкае расследаванне, рэпартаж і г. д.

Падрабязную інфармацыю аб крытэрыях ацэньвання можна знайсці на партале **www.nastaunik.info.**

**Даведка**

Фэйк — слэнгавы тэрмін, які абазначае падробку, копію або фальсіфікацыю. У дачыненні да сродкаў масавай інфармацыі пад фэйкам разумеюць навіну, якая не мае нічога агульнага з праўдай, так бы мовіць, падробку навіны. Фэйкі могуць кранаць за жывое тых, хто іх чытае. У гэтым выпадку ў чалавека адключаецца логіка, уключаюцца эмоцыі і ён верыць у самую неверагодную інфармацыю.




Прыняць удзел у конкурсе вельмі проста. Падумай, якія, на твой погляд, ёсць праблемы ў карыстанні прадукцыяй масмедыя. Выберы адну з іх і прапануй, як можна яе вырашыць. Але інфармацыя для тваёй бабулі і для твайго сябра павінна быць пададзена па-рознаму. Пры стварэнні свайго медыяпраекта прытрымлівайся журналісцкай этыкі і стандартаў, паважай аўтарскія правы. Дашлі свой праект ці спасылку на яго на адрас **mediakonkurs2019@gmail.com** з тваім прозвішчам у тэме ліста і намінацыяй (напрыклад: Саша Кавалевіч_ Мультымедыя).

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца падлеткі ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў. Работы прымаюцца да 15 красавіка. Пажадана выканаць іх на беларускай мове. Ацэньваць праекты і вызначаць пераможцаў будзе прафесійнае журы: вядомыя журналісты, рэжысёры, акцёры, педагогі-медыяэксперты, прадстаўнікі партнёрскіх арганізацый гэтага праекта.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Свой выбар

# ЗЛАДЖАНЫ ЭКІПАЖ

## МАЛАДАЯ ПАРА — ПРА РАБОТУ І ЖЫЦЦЁ Ў ВЁСЦЫ

**«У гарадскіх — ралі, а ў нас — гонкі на камбайнах», — жартуюць Кацярына СТРАЛКОВІЧ і Максім ПАПЛАЎСКІ, калі расказваюць пра сваю работу. Яны працуюць у гаспадарцы «Вішнявецкі-Агра» Стаўбцоўскага раёна. Ён механізатар, яна сакратар. Любяць вясковае жыццё і не гатовыя мяняць яго на сталічнае. Пра тое, ці можна на вёсцы нармальна зарабіць і як на спартакіядзе сустрэць каханне, пара расказала «Чырвонцы. Чырвонай змене».**



Максім прыйшоў у сельскую гаспадарку 14 гадоў таму. Яго бацька працаваў кіроўцам у калгасе, таму хлопец ужо з дзяцінства катаўся на трактарах. Скончыў абласны аграрна-тэхнічны прафесійны ліцэй у Дзяржынску і ўладкаваўся ў роднай вёсцы Аталезь. А год таму перавёўся ў Вішнявец.

— Зімой працую як механізатар і кіроўца. Нядаўна, напрыклад, на пагрузчыку кармы на ферме развозіў. А прыходзіць вясна — саджуся на трактар. Мне тут цікава, — кажа Максім.

— Ведаеце, ён фанацее ад тэхнікі, — далучаецца да размовы Кацярына. — Прыходзіць уборачная кампанія, ён пачынае па інтэрнэце шукаць, глядзіць камбайны сучасныя, якія за мяжой бываюць. Быццам на рабоце не хапае яму. *(Усміхаецца.)*

Дзяўчына ў гаспадарцы працуе восем гадоў. Сама яна родам з Вішнявца.

Гэтым летам Кацярына змяніла кабінет сакратара на кабіну камбайна — працавала ў пары з Максімам. «Сама ў шоку», — смяецца яна.

— Ніколі дагэтуль дзяўчат у памочніках не было, — прызнаецца хлопец. — Калі прыйшоў сюды працаваць, мала каго ведаў. Вось і прапанаваў Каці. Сказаў: «Там добра заплацяць. Я ж столькі гадоў на камбайне, усё ведаю, навучу».

— Дырэктар пагадзіўся. А я, што, адмаўляцца буду? Але, напэўна, гэта ўсё ж такі не жаночая справа. Ранкам я чысціла камбайн: працірала шкло, падмятала. І трэба было, каб на працягу ўсяго дня парадак у кабіне заставаўся — Максім вельмі ахайны. А пасля рапсу тэхніка ж моцна забруджваецца, чорнае ўсё... Дапамагала таксама разгружаць камбайн: там нескладана — трэба толькі націснуць на кнопачку.

> **«Слова за слова, расказваю яму, як пазнаёмілася тры гады таму з хлопцам. А Максім мне: гэта ж я быў».**

— Добра, што ў нас кандыцыянер быў. У папярэдняй гаспадарцы без яго ездзіў — вельмі спякотна: калі на вуліцы плюс 30, то ў кабіне ўсе 50. Я за жніво на пяць кілаграмаў худнеў. А тут сядзіш з камфортам, як у машыне.

Максім напарніцу хваліць: усю ўборачную дзень у дзень прабыла. Праўда, бядуе, што праз засуху ўсяго тысячу тон нажалі. Былі б іншыя ўмовы надвор'я, маглі б і дзве ўзяць. Іх экіпаж, дарэчы, быў узнагароджаны як адзін з найлепшых на конкурсе «Маладая Міншчына — за ўраджай», які арганізуюць абласны БРСМ і прафсаюз пры падтрымцы аблвыканкама.

— У нас канкурэнцыя паміж гаспадаркамі жорсткая, — прызнаецца Кацярына. — Пра лічбы ўборачнай кожны тыдзень у раённай газеце паведамляюць. А вынікі па гаспадарцы штодзень вывешваюць у гаражы.

...А пазнаёмілася пара каля дзесяці гадоў таму — на зімніх спаборніцтвах. Але раз'ехаліся тады, так і не абмяняўшыся нумарамі. А праз тры гады зноў сустрэліся на турбазе.

— Я яго не пазнала, — успамінае Кацярына. — Іншая каманда выступала, а мы чакалі на траве. І неяк



побач селі, спіна да спіны. Слова за слова, расказваю яму, як пазнаёмілася тры гады таму з хлопцам. А Максім мне: гэта ж я быў. Пасля і пачалі сустракацца. Ведаеце, зачапіў тым, што высокі, падцягнуты. Плюс адзенне ў яго было ярка-зялёнае, складана не заўважыць.

— А я яшчэ пасля першай сустрэчы хацеў прыехаць да яе ў вёску, але ўсё адцягваў.

— Ты не мог тры гады з Аталезя прыехаць? — здзіўляецца дзяўчына.

— Ну, далекавата. 30 кіламетраў, — вінавата пасміхаецца Максім.

Спаборніцтвы, дарэчы, нікуды не зніклі. Праз пару дзён пара едзе на спартакіяду сярод гаспадарак раёна.

— Мы ў настольны тэніс гуляем, — удакладняе Кацярына. — Максім летась, праўда, крыху не дацягнуў, а я стала найлепшай. Але цяпер будзем браць першыя месцы.

Ці можна на вёсцы нармальна зарабляць? Максім у гэтым упэўнены. Зімой, вядома, заробкі ў гаспадарцы невысокія, але падчас нарыхтоўкі кармоў камбайнер можа добрыя грошы атрымаць. Дый іншыя бонусы ёсць: збожжа выдзяляюць бясплатна, падарункі да свят даюць, прадуктовыя наборы.

Але рабочых месцаў, акрамя як у сельскай гаспадарцы, у вёсцы мала. Кацярына не хавае: многія адсюль з'язджаюць у сталіцу.

— А вы не хочаце?

— Ведаеце, калі б мне прапанавалі зараз у горад ехаць, я не пагадзілася б. Хоць жыла неяк у Мінску. У вёсцы — прырода, свой дом. Я люблю кветкаводства: вырошчваю ў палісадніку ружы, лілії.

Дзяўчыну вясковае жыццё задавальняе. Адзіны мінус — няма забаў. Ні басейна, ні кіно (хоць апошняе было некалі). Таму многія ідуць з работы дадому і сядзяць у інтэрнэце: сумна.

— Раней дыскатэкі кожную суботу праводзілі. Разумею, іх закрылі, бо моладзь перастала хадзіць. А перастала, бо дыджэя няма. Да нас неяк са Стаўбцоў прыязджалі праводзіць дыскатэку — з дымам, святлом — вось гэта было цікава, — дзеліцца дзяўчына. — На шчасце, у нас ёсць машына. Калі Максім за рулём, калі я. На Новы год у Нясвіж паехалі, там боўлінг працуе. У кіно таксама туды ж выбіраемся.

— А на шопінг куды?

— Апошні раз ездзілі ў Барանавічы на рынак. А так звычайна на «Ждановічы» ў Мінск.

Ёсць у пары сумеснае хобі — рыбалка. Ходзяць на платнае возера ў суседнюю вёску або на Нёман: на рацэ Максім шчупакоў ловіць.

— Не так страшна ў вёсках, як здаецца, — жартуе Кацярына.

Дый перспектыва абзавесціся сваім домам ёсць. Гаспадарка якраз некалькі новых будавалася збіралася...

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**
*Стаўбцоўскі раён.*

# «Магу перабл<br>ытаць людзей, а дэльфінаў — ніколі!»



*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Як жывёлы трапляюць да вас?***

— Прыходзіць кіраўніцтва і кажа: «Вось табе звер, рабі з яго «зорку»! *(Смяецца.)* На самай справе яны паступаюць не ў дэльфінарыі, бо тут няма сэнсу трымаць непадрыхтаваных жывёл, а напачатку — на тры падрыхтоўчыя базы ў краіне. Існуюць спецыяльныя школы, дзе дэльфіны праходзяць так званы курс маладога байца, сацыялізацыю, а потым ужо напалову падрыхтаваных жывёл адпраўляюць па шматлікіх дзеючых дэльфінарыях.

***— Дрэсіроўка — творчы працэс...***

— Графік у нас абсалютна ненармаваны, дакладнага раскладу няма. Мая работа, як вы і сказалі, — гэта творчы працэс. Для таго каб дасягнуць сапраўды добрых вынікаў, трэба, каб настрой быў добры і ў трэнера, і ў падапечных. Калі я прыйду ў дэльфінарый з вачыма, якія гараць, і неверагодным жаданнем працаваць, а жывёла ў гэты дзень не настроена на тое ж самае, то біцца бессэнсоўна. А вось калі я бачу, што ў яе добры і творчы настрой, то магу прапанаваць вывучыць новыя трукі. Прымушаць іх не трэба. У дэльфінаў дакладнае разуменне: двухногія — гэта весялосць, яны даюць магчымасць пацешыцца.



І не трэба разбураць гэта іх уяўленне пра нас.

***— Раскажыце крыху пра вашых падапечных. Ці раўнуюць яны вас адзін да аднаго?***

— Дэльфіны да марскіх ластаногіх ставяцца спакойна, асаблівай рэўнасці не заўважаў, а вось паміж сабой яны, цалкам магчыма, могуць думаць: «Гэта мой двухногі». *(Смяецца.)* У нас жыве тры дэльфіны: Геркулес, Х'юга, Віта. Геркулес — альфа-самец, лідар, яшчэ ён вельмі адказны, усё робіць «ад» і «да». Калі ў яго настрой працаваць, а двое іншых не хочуць, то Гера ўсё роўна настойвае на сваім. Х'юга ў нас самы малодшы, жвавы і цікаўны. А яшчэ ён любіць вучыцца нечаму новаму. Віта адзіная дзяўчынка. З дзяўчаткамі-дэльфінамі звычайна крыху больш складана. Яны ствараюць легкадумныя і капрызлівыя, любяць увагу, лёгка і хутка крыўдзяцца.

***— Усе трукі — гэта заслуга трэнера?***

— Ёсць базавыя нумары, абавязковыя ў праграме. Нейкія больш складаныя дзеянні з'яўляюцца самі сабой. Ёсць тры прыёмы: першы — гэта калі трэнеру «стукнула» ў галаву, другі — глядзім нумары з дэльфінарыяў з іншых краін і спрабуем паўтарыць, а трэці варыянт — самая лянівая методыка. Гэта калі жывёлы выдумляюць нумары, а ты стаіш і хваліш іх. *(Смяецца.)*

***— Што самае складанае ў рабоце?***

— Калі цябе не слухаюцца. Калі трэба растлумачыць, што ты не галоўны, а кампаньён. У такія моманты трэба сабрацца, узяць сябе ў рукі і знайсці кампраміс.

***— Ці адбіваецца ваш занятак на будзённым жыцці?***

— Пакуль я нечаму вучу жывёл, яны таксама вучаць мяне. Я веру, што за гэтыя гады вельмі моцна змяніўся. А што датычыцца сям'і, то мяне падтрымліваюць у маёй справе. Дарэчы, жонка — трэнер марскіх млекакормячых, таму мы адно аднаго выдатна разумеем.

**Ангеліна НОВІКАВА,**
**студэнтка II курса**
**Беларускага дзяржаўнага**
**універсітэта культуры**
**і мастацтваў.**

*Нябачныя масты*

# «Мару правесці сваё жыццё ў Беларусі...»

**Здараецца, што для цікавага знаёмства дастаткова простага «прывітанне» альбо «hello». З гэтага кароткага слова і шчырай усмешкі ў ліфтхоле студэнцкага інтэрната і завязалася мая размова з афрыканцам Кофі Баатэнгам Скаем.**



Па праўдзе, гутаркі магло і не адбыцца: хлопец па-нашаму не разумее. Для таго каб ён змог атрымаць бялізну ў кастэлянкі, на дзве хвіліны я стала яго перакладчыкам. І хоць маё валоданне англійскай мовай не дазваляе камунікаваць напоўніцу, афрыканец запэўніў: «Не хвалюйся, ты добра размаўляеш. На жаль, я рэдка сустракаю людзей, якія маглі б вольна са мной пагутарыць. З-за гэтага часта сумую...»

Слова за слова, і вось я ўжо ведаю яго імя, узрост (28 гадоў) і тое, што ён першакурснік Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага інстытута імя А. Д. Сахарава пры БДУ. Мне было цікава даведацца пра яго родныя мясціны, бачане афрыканцам нашай краіны. А яму — знайсці яшчэ аднаго сябра.

— Я з Рэспублікі Гана, што ў Заходняй Афрыцы, — з цеплынёй расказваў тады Баатэнг Скай. — Мой родны горад Кумасі — другі па велічыні ў краіне. Вельмі люблю гэтае месца з прасторнымі раўнінамі і неверагоднымі плато, дажджавымі лясамі і вялікімі сінімі азёрамі. Там жыве мая вялікая сям'я: у мяне яшчэ ёсць тры браты і тры сястры.

**— Як жа ты трапіў да нас?**

— Аднойчы прыняў прапанову сябра сям'і, які ажаніўся з беларускай. Ён дапамог мне з афармленнем дакументаў для паступлення ў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Не тое, каб у нас дрэнныя ВНУ, наадварот! Я вучыўся дома на праграміста. Аднак у вас хачу не толькі атрымліваць веды, але і знаёміцца з рознымі, зусім іншымі людзьмі.

**— І як табе наша краіна?**

— Я ў захапленні! Лічу, што знайшоў сябе тут. Шкада толькі, што замежныя студэнты не могуць нідзе працаваць падчас вучобы... Людзі тут добрасардэчныя і ветлівыя. Адзінае, не ўсе валодаюць замежнымі мовамі...

**— Але ж у цябе ёсць сябры?**

— Вядома! У вольны час заўсёды заходжу да іх у суседнія пакоі — жывём жа ў адным інтэрнаце! Мы разам гатуем, ядзім, а потым знаходзім якія-небудзь забавы. Заходзь, калі ласка, да нас у госці, будзем рады!

Аднак тады, праз занятасць, ні ўбачыцца яшчэ раз, ні даведацца больш адно пра аднаго не атрымалася. Стасункі ўзнавіліся толькі праз некалькі месяцаў у сацыяльнай сетцы. І за гэты час жыццё Баатэнга павярнулася амаль што на 180 градусаў...

— Я больш не жыву ў Беларусі, — піша афрыканскі знаёмы. — Тата, які аплачваў маю вучобу ў вашай краіне, памёр, а маці не змагла забяспечыць маё пражыванне за мяжой...

Як высветлілася, Баатэнг з'ехаў у Дубай з адной мэтай: знайсці працу з добрым заробкам. І ў выніку атрымаў яе ў тамтэйшым Нацыянальным банку. Нягледзячы на тое, што Дубай — даволі дарагі горад, хлопцу хапае грошай, каб здымаць кватэру, жыць ні ў чым сабе не адмаўляючы, а таксама адкладваць грошы. Для чаго? Каб вярнуцца ў Беларусь!

— Я не хачу жыць у Дубаі, — кажа афрыканец. — Веру, што абавязкова скончу навучанне ў вашай краіне. Я сапраўды хачу правесці ў Беларусі ўсё сваё жыццё. Бо палюбіў тутэйшыя клімат, традыцыі, ежу. А яшчэ — людзей... Сумую па сваіх беларускіх сябрах штодня...

Магчыма, калі-небудзь і я стану сябрам для цікавага і цікаўнага афрыканца Кофі Баатэнга Ская. Бо мы працягваем ліставацца, абмяркоўваем самыя розныя тэмы: рэлігію, культуру, планы на будучыню. Наперадзе ў ганца — цяжкі працоўны год. Галоўнае, мы з ім верым у лепшае і спадзяёмся на хуткую сустрэчу.

**Юлія АДАМОВІЧ, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

*Вяртанне ў маленства*

# ПА ЎРАЖАННІ — НА РЫЖСКАЕ ЎЗМОР'Е

**Дзе жыў савецкі Шэрлак Холмс? Дзе вырабляюць, бадай, самыя вядомыя і смачныя шпроты, а архітэктуру можна лічыць наглядным канспектам па стылі мадэрн? Адказ адзін — у Рызе. Трэба сказаць, што з гэтым горадам мяне звязваюць асаблівыя пачуцці. Там я нарадзілася: тата заканчваў Рыжскае вышэйшае ваеннае вучылішча. Праўда, у латышскай сталіцы я пражыла ўсяго некалькі месяцаў і з таго часу ні разу там не была. У Год малой радзімы выпраўляю гэту недарэчнасць! А заадно дзялюся парадамі, як нясумна правесці выхадныя непадалёк ад узбярэжжа Балтыйскага мора.**



Ратушная плошча з Домам Чорнаголовых.

## Пеўні на шпілях і гарматы ў зямлі

У Рыгу варта ехаць па сярэднявечную атмасферу. Брукаваныя вуліцы ў цэнтры горада, здаецца, яшчэ памятаюць, як па іх хадзілі рыцары, епіскапы і каты. Пра апошніх тут ёсць цікавая легенда. Кажуць, кат некалі жыў у доме са Шведскімі варотамі і, каб папярэдзіць мясцовых жыхароў пра чарговае пакаранне смерцю (а іншых «забаў» для беднага насельніцтва ў тыя часы асабліва і не было), выстаўляў у акне чырвоную ружу.

Славутасці, якія абавязкова трэба ўбачыць, — гатычная царква святога Пятра (да таго, як з'явілася Рыжская тэлевежа, яна была самым высокім будынкам у горадзе), Домскі сабор XIII стагоддзя, куды турысты сцякаюцца паслухаць арган, Дом Чорнаголовых (тут жыло аднайменнае купецкае брацтва) з багатым фасадам.

На шпілях храмаў засталіся флюгеры-пеўнікі: для партовага горада важна было ведаць напрамак ветру. Да таго ж певень лічыўся хрысціянскім сімвалам, які нагадвае пра адрачэнне апостала Пятра. Іншая цікавінка горада — гарматы, закапаныя дуламі ў зямлю. Кажуць, так загадаў зрабіць Пётр I — у знак таго, што тут ніколі больш не будзе вайны.

Шпацыруючы па латышскай сталіцы, можна ўбачыць, што сабой уяўляе стыль мадэрн (ці, як яго тут называюць, югендстыль). Або перанесціся ў... Швецыю. Справа ў тым, што ў XVII стагоддзі Рыга была заваявана шведскім каралём, і гэта паўплывала на мясцовую архітэктуру: некаторыя дамы вельмі падобныя да тых, што стаяць у Стакгольме. Хочаце ўбачыць, дзе здымалася савецкае кіно? Тады вам на вуліцу Яўніела, больш вядомую пад назвай Кветкавая, як у «Сямнаццаці імгненнях вясны», ці Бэйкер-стрыт, як у «Прыгодах Шэрлака Холмса і доктара Ватсана».

Убачыце будынак з чорнымі катамі на даху — успомніце смешную легенду. Стагоддзе таму тут жыў багаты домаўладальнік. Ён хацеў уступіць у Вялікую гільдыю, якая засядала акурат праз дарогу, але яму адмовілі. Каб адпомсціць, мужчына ўстанавіў на доме скульптуры катоў — хвастамі ў бок вокнаў кабінета старэйшыны гільдыі. І толькі калі атрымаў запаветнае членства, пагадзіўся развярнуць «мурлыкаў».

## Бюджэтны транспарт — ...таксі

Зручны спосаб перамяшчацца па горадзе — на трамваі. Білет каштуе крыху больш за еўра (калі набываць у кіроўцы, то два еўра), але ў святочныя дні праезд бывае бясплатным. А калі апынецеся ў Рызе летам, зможаце праехацца на рэтра-трамваі — ён быў адноўлены па чарцяжах пачатку мінулага стагоддзя.

Тыя, хто падарожнічае кампаніяй, могуць лёгка дазволіць сабе таксі. З ускраіны да цэнтра рэальна даехаць за чатыры еўра.

Паглядзець на горад з вышыні турыстычныя гіды раяць з Рыжскай тэлевежы. Але па-першае, гэта платна. Па-другое, тэлевежа нядаўна закрылася на рэканструкцыю. Таму лавіце іншы (бясплатны!) варыянт — гатэль Radisson Blu, што знаходзіцца непадалёк ад помніка Свабоды (вельмі падобнага да стэлы на мінскай плошчы Перамогі). На 26-м паверсе гасцініцы працуе бар з панарамнымі вокнамі, адкуль адкрываецца цудоўны від на гістарычны цэнтр. А калі аглядаеш горад, спускаючыся ў шкляным ліфце, дух захоплівае ў прамым сэнсе гэтага слова.

Каб зарадзіцца ўдачай, шукайце помнік Брэменскім музыкам. Падказка для студэнтаў: па прыкмеце, калі дацягнуцца да дзюбы пеўня, сесію здасце на «выдатна».

## Санаторый з пляжам

Ехаць на халодную Балтыку зімой — сумнеўная ідэя. Але быць у Рызе і не паглядзець Юрмалу, да якой адтуль усяго паўгадзіны дарогі, недаравальна.

Скажу шчыра: папулярны курорт крыху расчараваў. Некаторыя асабнякі стаяць закінутыя, а легендарная канцэртная зала «Дзінтары» ў рэчаіснасці зусім не такая, якой яе бачыш па тэлевізары. Але ў Юрмалы ёсць сваё абаянне. Высокія сосны, драўляныя дамы ў югендстылі, утульныя рэстаранчыкі — такі гарадок-санаторый, дзе хочацца не спяшаючыся піць рамонкавую гарбату і пісаць мемуары. А ў перапынках бегаць на пясчаны пляж, каб удыхнуць салёнага паветра і паслухаць шум мора. Зімой пустому ўзбярэжжу асаблівы каларыт надаюць вароны, якія, уявіўшы сябе чайкамі, плёскаюцца ў халоднай вадзе.

Бліжэй пазнаёміцца з латышскімі традыцыямі можна ў Юрмальскім музеі пад адкрытым небам. Праўда, ехаць туды лепш з мая да канца верасня — у гэты час турыстам прапануюць навучыцца вэндзіць рыбу, паслухаць народную музыку і асвоіць старажытныя рамёствы (напрыклад, віць вяроўкі і вязаць вузлы).

## Асцярожна: далікатэс!

Бадай, найлепшыя ўражанні, якія можна прывезці з падарожжа, — гастранамічныя. Зазірніце ў адзін з рэстаранаў у сярэднявечным стылі. Яны месцяцца ў падвалах старых будынкаў, дзе яшчэ захавалася цагляная кладка і векавыя калодзежы. Антураж адпаведны: у зале паўзмрок замест лямпачак свечкі, афіцыянты адзеты па модзе тых часоў, а масіўныя дзверы зачыняюцца пры дапамозе механізма з падвешанымі гірамі. Цэннік у такіх установах, вядома, высокі — гарачая страва каштуе 16—19 еўра. Затое той свіной галёнкі хопіць на дваіх (і яшчэ на «ссабойку» застанецца — праверана на сабе).

Каб адведаць свежай рыбы, ідзіце на Цэнтральны рынак (аналаг нашай Камароўкі). Ласося там засольваюць адразу пры куплі — і праз дзве-тры гадзіны ён ужо гатовы да ўжывання. Тут жа знойдзеце славутыя рыжскія шпроты: гаспадынь парадуе не толькі смак, але і тое, што рыбінкі ў кансервах як на падбор.

Мясцовым далікатэсам лічаць міногу. Перш чым адведаць, пагугліце, што гэта за рыба. Міногу называюць «марскім вампірам», і нездарма: ежу сабе яна здабывае тым, што, як піяўка, паразітуе на іншых. А яе рот падобны да варонкі, усеяны мноствам зубоў. Бр-р! На смак той далікатэс — нічога асаблівага (хоць тыя, хто каштаваў вугра, кажуць, што вельмі падобна да яго).

У крамах з шыльдай Laima знойдзеце вядомы латвійскі шакалад. Але са спявачкай Лаймай Вайкуле ён не мае нічога агульнага: назву фабрыка атрымала па імені старажытнабалтыйскай багіні шчасця і лёсу.

І яшчэ адна візітная картка краіны — рыжскі бальзам. Ён настойваецца на 24 інгрэдыентах (сярод якіх бярозавыя пупышкі, дубовая кара, ліпавы цвет) і лічыцца лячэбным. Але паколькі гэта моцны алкагольны напой, ужываць яго трэба акуратна. Мясцовыя жыхары ніколі не п'юць бальзам нашча і да 12 дня.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Фота аўтара.**

«Свидетельство о государственной регистрации научно-производственного общества с ограниченной ответственностью «Спектральные оптические технологии» (УНП 100809169) считать недействительным в связи с утерей».

## Информация о внесении изменений в извещение о проведении аукциона

В извещение о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «Узденский», опубликованном в газете «Звязда» от 23.01.2019 на стр. 6, вносятся следующие изменения:

«Аукцион состоится **06.03.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324».

«Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.03.2019** до **16.00».**

«Задаток за участие в аукционе составляет 15 % от начальной цены – **613,00** белорусских рублей».

«Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 30 (тридцати) календарных дней после проведения аукциона».

УНП 600002438

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Доломит» (продавец)

**Лот № 1.** Силосный склад цеха № 2, инв. № 200/С-96175, площадь – 1588,2 кв. м, г. п. – 1967. Адрес: г. Витебск, ул. Центральная, 25/31. **Начальная цена, бел. руб.** – 178 908,00 с НДС. **Задаток, бел. руб**. – 20 000,00. **Шаг аукциона** – 5 %.

**Земельный участок:** 240155400001000020, долевое пользование. Переход права на долю земельного участка осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Размер штрафа, в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609, составляет 30 000,00 белорусских рублей.

**Аукцион состоится 22.02.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Доломит», проводимом 22.02.2019 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д.11, 3-й этаж, каб. 7. Окончание приема заявлений: 20.02.2019 в 11.00. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 21.11.2018

Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец имущества) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 25 февраля 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 60 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| | **Условие продажи: 1.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производятся Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **Примечание:** в соответствии с действующим Законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) **реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %** | | | |
| | **Местонахождение лотов №№ 1–4, 8:** Гомельская область, Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7 | | | |
| 1 | Установка для приема товарного бетона УВР-7, № 936 | **2 731,60** | 136,58 | 273,16 |
| 2 | Фильтр ФЭСВ-1200 с вытяжным устройством R-7,3М, № 971 | **820,00** | 41,00 | 82,00 |
| 3 | Штукатурная станция СШВ-6 (передвижная), № 904 | **1 040,80** | 52,04 | 104,08 |
| 4 | Штукатурная станция ШС-4/6 №44/10083 | **1 098,80** | 54,94 | 109,88 |
| 8 | Малярная станция (вагон), № 176 | **1 084,00** | 54,20 | 108,40 |
| | **Местонахождение лотов №№ 10, 11:** Гомельская область, Рогачевский р-н, н. п. Заречье | | | |
| 10 | Вагон-бытовка 9000*3000, № 44/10080 | **1 210,40** | 60,52 | 121,04 |
| 11 | Вагон-бытовка 9000*3000, № 44/10079 | **1 148,80** | 57,44 | 114,88 |
| 12 | Вагон-бытовка 9000*3000, № 44/10081. **Местонахождение:** Гомельская область, Рогачевский р-н, а. г. Тихиничи | **1 150,80** | 57,54 | 115,08 |
| 13 | **Капитальное строение с инв. № 322/С-17016**, общей площадью **7,0 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торовых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное кирпичное здание насосной станции с резервуаром чистой воды (инв. № 96). Капитальное строение с инв. № 322/С-13307**, общей площадью **25,9 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торовых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное кирпичное здание склада кислородных баллонов (инв. № 95). Капитальное строение с инв. № 322/С-17013**, общей площадью **29,3 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное металлическое здание навеса для металлических баллонов (инв. № 10050). Капитальное строение с инв. № 322/С-17014**, общей площадью **12,4 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торовых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное металлическое здание склада для металлических баллонов (инв. № 10051). Капитальное строение с инв. № 322/С-17012**, общей площадью **133,2 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное дощатое здание (инв. № 10059). Капитальное строение с инв. № 322/С-13309**, общей площадью **460,1 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **двухэтажное кирпичное административное здание с подвалом (инв. № 91а). Местонахождение:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кожедуба, д. 3. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **324750100002000064,** общей площадью **1,8809 га (право постоянного пользования).** Целевое назначение земельного участка: для обслуживания производственной базы (СПМК-44). **Подробный и полный перечень имущества по лоту № 13 опубликован в газете «Звязда» от 23.08.2018 г. № 161 (28777)** | **220 540,00** | 11 027,00 | 22 054,00 |
| | **Местонахождение лотов №№ 14, 15:** Гомельская область, Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кожедуба, 3 | | | |
| 14 | Станок токарно-винторезный, № 44/66 | **1 480,00** | 74,00 | 148,00 |
| 15 | Станок трубонарезной ВМС-2А с резьбонарезной головкой и комплектом головок, № 44/40217 | **920,00** | 46,00 | 92,00 |
| | **Местонахождение лотов №№ 17, 18, 20:** Гомельская область, Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кирова, д. 28 | | | |
| 17 | Станок токарно-винторезный 16ГС30-01, инв. № 44/44а | **2 677,20** | 133,86 | 267,72 |
| 18 | Форма для пустотных плит ПК-72-15, инв. № 44/325 | **1 533,20** | 76,66 | 153,32 |
| 20 | Емкость металлическая (горизонтальная). 25 куб. м, инв. № 44/61926 | **1 215,20** | 60,76 | 121,52 |
| | **Местонахождение лотов №№ 23–28, 32, 36, 38, 43–48, 51, 53, 55–59, 61–63:** Гомельская область, Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7 | | | |
| 23 | Автомобиль ГАЗ-САЗ – 3507, рег. № 8545 ГСН, г. в.1989, цвет – голубой, тип ТС – грузовой самосвал | **1 200,00** | 60,00 | 120,00 |
| 24 | Автомобиль ЗИЛ-ММЗ- 4502, рег. № ЕА 5611, г. в. 1991, цвет – голубой, тип ТС – грузовой самосвал | **1 080,00** | 54,00 | 108,00 |
| 25 | Автомобиль МАЗ 5432 А5, рег. № АВ 6370-3, г. в. 2008, цвет – белый, тип ТС – грузовой седельный тягач | **3 520,00** | 176,00 | 352,00 |
| 27 | Автомобиль МАЗ 5432 А5, рег. № АК 3524-3, г. в. 2008, цвет – белый, тип ТС – грузовой седельный тягач | **3 320,00** | 166,00 | 332,00 |
| 28 | Автомобиль МАЗ 6422 А5, рег. № АК 3525-3, г. в. 2009, цвет – желтый, тип ТС – грузовой седельный тягач | **5 840,00** | 292,00 | 584,00 |
| 32 | Автобетоносмеситель МАЗ 6303А3 СМБ-372-30, рег. № АЕ 0215-3, г. в. 2009, цвет – белый, тип ТС – грузовой специальный автобетоносмеситель | **15 040,00** | 752,00 | 1 504,00 |
| 36 | Узел бетонный самозагружающийся FIORI DB350S, рег. № ЕВ-3 0370, г. в. 2008 | **32 680,00** | 1 634,00 | 3 268,00 |
| 38 | Экскаватор пневмоколесный гидравлический EW- 1400, рег. №ЕВ-3 4134, г. в. 2011, марка двигателя – Д-245 | **31 080,00** | 1 554,00 | 3 108,00 |
| 43 | Автомобиль ГАЗ 5201, рег. № 7134 ГСП, г. в. не определен, цвет – голубой, тип ТС – грузовой бортовой | **1 040,00** | 52,00 | 104,00 |
| 44 | Автомобиль МАЗ 555102 2125, рег. № EI 0329, г. в. 2005, цвет – оранжевый, тип ТС – грузовой самосвал | **3 120,00** | 156,00 | 312,00 |
| 45 | Автомобиль ГАЗ 32213, рег. № АВ 4799-3, г. в. 2008, цвет – темно-сине-зеленый, тип ТС – автобус-вагон | **1 400,00** | 70,00 | 140,00 |
| 46 | Автомобиль ГАЗ 32213, рег. № АВ 4800-3, г. в. 2008, цвет – темно-сине-зеленый, тип ТС – автобус-вагон | **1 440,00** | 72,00 | 144,00 |
| 47 | Автомобиль МАЗ 5336 А3, рег. № AI 6327-3, г. в. 2009, цвет – белый, тип ТС – грузовой бортовой | **6 560,00** | 328,00 | 656,00 |
| 48 | Автомобиль МАЗ 5551 А2 рег. № АВ 5783-3, г. в. 2008, цвет – белый, тип ТС – грузовой самосвал | **5 240,00** | 262,00 | 524,00 |
| 51 | Автомобиль УАЗ 39094, рег. № ЕС7603, г. в. 2004, цвет – зеленый, тип ТС – грузовой бортовой тентовый | **1 440,00** | 72,00 | 144,00 |
| 53 | Автомобиль УАЗ 390902, рег. № АЕ 3994-3, г. в. 2004, цвет – светло-серый, тип ТС – грузопассажирский вагон | **1 400,00** | 70,00 | 140,00 |
| 55 | Полуприцеп МАЗ 938662, рег. № А 2345А-3, г. в. 2008, цвет – зеленый, тип ТС – полуприцеп бортовой | **2 680,00** | 134,00 | 268,00 |
| 56 | Полуприцеп МАЗ 931010, рег. № А 2347А-3,г. в. 2008, цвет – зеленый, тип ТС – полуприцеп бортовой | **2 760,00** | 138,00 | 276,00 |
| 57 | Полуприцеп МАЗ 975800, рег. № А 3169А-3, г. в. 2008, цвет – зеленый, тип ТС – полуприцеп бортовой | **3 600,00** | 180,00 | 360,00 |
| 58 | Прицеп МАЗ 837810-(042), рег. №1988 АА-3, г. в. 2009, цвет – серый, тип ТС – прицеп бортовой | **2 560,00** | 128,00 | 256,00 |
| 59 | Прицеп МАЗ 8571, рег. № А 2334А-3, г. в. 2008, цвет – серый, тип ТС – прицеп самосвал | **2 200,00** | 110,00 | 220,00 |
| 61 | Автомобиль УАЗ 3303, рег. № ЕС 7443, г. в. 1994, цвет – серый, тип ТС – грузовой бортовой тентовый | **1 160,00** | 58,00 | 116,00 |
| 62 | Кран башенный МСК 10-20, 1982 г. в., зав. № 153, инв. № 415, рег. номер 8982, грузоподъемность 12,5 т. Недвижимые улучшения – сооружение инв. № 979 (наименование – ограждение подкрановых путей) | **5 536,00** | 276,80 | 553,60 |
| 63 | Комплекс мобильный агрегатированный «МАК-Бетон» СМБ-004ЕК | **15 440,00** | 772,00 | 1 544,00 |
| 64 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-16612** общей площадью **24,9 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание контрольно-пропускного пункта. Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7, участок № 1. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340800000001000009** общей площадью **0,0344 га (право постоянного пользования)** | **2 280,00** | 114,00 | 228,00 |
| 65 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-16609**, общей площадью **1 339,4 кв. м,** назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **одноэтажное кирпичное, с двумя кирпичными пристройками, здание гаража на восемь транспортных единиц. Капитальное строение с инв. № 320/С-16605** общей площадью **357,5 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание механических мастерских. Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7, участок № 3. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321850100001003854** общей площадью **0,9337 га (право постоянного пользования)** | **154 000,00** | 7 700,00 | 15 400,00 |
| 66 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-16611** общей площадью **62,7 кв. м,** назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – **автозаправочный пункт, состоящий из одноэтажного кирпичного здания операторской и восьми стальных емкостей общим объемом V=350 т топлива, находящихся на бетонной площадке. Капитальное строение с инв. № 320/С-16615** общей площадью **347,5 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное, с кирпичной пристройкой, здание банно-прачечного комбината. Капитальное строение с инв. № 320/С-16613** общей площадью **403,7 кв. м,** назначение – здание специализированное для производства строительных материалов, наименование – **здание растворобетонного узла. Капитальное строение с инв. № 320/С-16607** общей площадью **54,6 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **здание склада цемента. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 19В/7. **Капитальное строение с инв. № 320/С-16608** общей площадью **387,9 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное кирпичное, с дощатой пристройкой, здание склада с пристроенным навесом.** Недвижимые улучшения – сооружение инв. № 067 (наименование – артезианская скважина). Инженерные сети – воздушные линии электропередачи ВЛ-0,4, инв. № 391. Инженерные сети – канальная линия электропередачи, инв. № 402. Инженерные сети – водопроводная сеть с инв. № 899. Недвижимые улучшения – сооружение инв. № 364 (наименование – водонапорная башня). Недвижимые улучшения – сооружение инв. № 068 (наименование – ограждение территории (забор). **Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7, участок № 4. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321850100001003855** общей площадью **2,8275 га (право постоянного пользования). Капитальное строение с инв. № 320/С-25866** общей площадью **50,5 кв. м,** назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – **трансформаторная подстанция № 727. Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7/1. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321850100001001491** общей площадью **0,0114 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** земельный участок для обслуживания трансформаторной подстанции № 727 | **80 204,00** | 4 010,20 | 8 020,40 |
| 67 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-16671** общей площадью **504,2 кв. м,** назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – **здание лесоцеха. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г Жлобин, ул. Ленинградская, д. 7Д/2. **Капитальное строение с инв. № 320/С-16668** общей площадью **475,5 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное панельное, с каркасно-засыпной отапливаемой пристройкой, здание цеха по изготовлению щитовых домиков. Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7А. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321850100001003798** общей площадью **0,9625 га (право постоянного пользования)** | **36 400,00** | 1 820,00 | 3 640,00 |
| 68 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-16670** общей площадью **2 822,6 кв. м,** назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – **одноэтажное кирпичное здание столярного цеха с двумя отдельно расположенными бытовыми помещениями и навесом для хранения готовой продукции. Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7А. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340800000001000107** общей площадью **1,0320 га (право постоянного пользования).** Котел водогрейный МИР-95 (инв. № 823) | **94 348,40** | 4 717,42 | 9 434,84 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию – Кучинский Владимир Александрович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости – Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 7 февраля 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 21 февраля 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 5 (пять) дней до его проведения.**

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-3 (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст. 127–129. Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 14.08.2018 г. № 154 (28770). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

**Вадзім Крук працуе інжынерам. Любіць літаратуру, гісторыю і рок-музыку, цікавіцца з'яўленнем і развіццём сучасных медыя. Марыць знайсці новыя, нечаканыя літаратурныя прыёмы ў малой прозе, бо лічыць, што сёння, у час высокіх хуткасцяў, блогаў ды сацыяльных сетак, у яе ёсць шанц перажыць новы росквіт.**



**Вадзім КРУК**

# КВЕТКІ НА АСФАЛЬЦЕ

*Урывак з апавядання*



НОЧЧУ пасвяжэла, дыхаецца лягчэй. Праз прыадчыненае акно таксі з вулічных тэрас рэстарацый у салон прарываюцца пахі ежы ды цыгарэтнага дыму, змешваюцца з салодкім мятным водарам аўтамабільнага асвяжальніка. На галоўным праспекце людзей яшчэ шмат. Носяцца туды-сюды машыны, на тратуарах абдымаюцца і смяюцца закаханыя.

Горад не спіць. Ён разняволена раскінуў натомленыя за дзень вуліцы-рукі і лашчыцца ў абдымках доўгачаканага лёгкага ветру.

Антон хіліць галаву на бок. Выхоплівае вачыма вулічныя карцінкі: вітрыны крамаў, святлафоры, транспарт. Святло ліхтароў, фасадных свяцільнікаў зліваецца ў адзіную яркую пляміну, якая цягнецца паўз усю вуліцу побач з аўто. Штосьці ціха мармыча таксіст. Антон адчувае, што яго ногі больш не стаяць, а вісяць над безданню. Пахне ракой і лесам. Апошняя думка працярэбліваецца праз туман дрымоты: «Мусіць, Свіслач і парк».

ХЛОПЕЦ кружыцца, падае, узлятае пад самыя зоры, а потым апынаецца ў светлым, гонкім гаі. Тут так утульна і бяспечна, што адразу прыгадваецца дзяцінства. Антон глядзіць на свае рукі. Яны маленькія, дзіцячыя, праз тонкія пальцы струменіць святло. Ён не здзіўляецца гэтаму, як не здзіўляецца і таму, што стаіць босы і што птушкі на дрэвах маюць твары яго сяброў, а ўся паляна скрозь засыпана кветкамі. Яны жвава поўзаюць па траве, спрытна лезуць на дрэвы, на ногі Антона, дапамагаючы сабе лісцем і пялёсткамі. Антон не баіцца. Ён заваражана назірае за такім дзівам, пакуль знячэўку не адчувае руку ў сябе на плячы. Чуецца ласкавы жаночы голас, так падобны да Юльчынага:

— Скажы мне, любы...

— Што сказаць? — рэзка паварочваецца Антон і бачыць перад сабой жанчыну з парку. Толькі твар яе страшны, перакошаны вусцішнай усмешкай, пакрыты воспінамі і зморшчынамі.

— Скажы, чаму мае кветкі выкінуў? — яна жудасна смяецца, выскальвае жоўтыя зубы, крычыць на яго: — Чаму? Чаму? Скажы! Скажы! Сволач, сволач, сволач...

СЭРЦА грукоча, аддаецца ў вушах, спіна халадзее. Антон скаланаецца, расплюшчвае вочы, азіраецца. Чырвонае вока святлафора, машыны наперадзе і па баках, касцельная вежа над дахамі старасвецкіх дамкоў, раздражнёны таксіст. Ён заўважае, што кліент прачнуўся.

— Сволач якая, дзівіся, — фамільярна звяртаецца шафёр да пасажыра.

— Што? — разгублена пытаецца Антон, ізноў пачуўшы гэтае слова.

— Я кажу, што калі сеў за руль, дык вядзі сябе па-людску, а не як баран. Вунь, — паказвае ён на машыну перад сабой. — Мала таго што падрэзаў і стаў наперадзе, дык яшчэ і левы паварот урубіў у апошні момант. Цяпер чакай, калі праедзе.

Таксіст нервуецца, варушыць вусамі.

— А-а-а, ну так, — цягне пасажыр, а сам разумее, як у сон трапіла лаянка.

Антон больш не спіць. Яму тужліва і сорамна, слёзы пакрыўджанай зноў паўстаюць перад вачыма. Толькі дом і прадчуванне хуткага адпачынку на імгненне супакойваюць. Грошы таксісту, шумны смуродны ліфт, прыбіральня — і вось ён, нарэшце, у ложку. Антон доўга глядзіць у столь, змагаецца з цяжкімі думкамі, пакуль галава не робіцца пустой, як закінутая хата, у якой праз выбітыя шыбы гудзе, гуляе вецер. Ён валіцца ў сон.

ВЫХАДНЫЯ праходзяць нудна і аднастайна. Гадзінамі ён сядзіць за камп'ютарам, потым павольна сунецца да халадзільніка, нешта есць, ізноў утаропліваецца ў сацыяльныя сеткі, серыялы ды смешныя відэа з інтэрнэту. А яшчэ злуе, бо ніяк не можа адбіцца ад згрызот сумлення.

Ён не разумее, чаму гэты выпадак прымушае цяпер думаць не толькі пра гісторыю з няшчаснай жанчынай, але і пра ўсе свае непрыгожыя ўчынкі, якія толькі можна ўспомніць. Ён думае пра пакуты майстра і Юлі, у якіх цяпер не сумняваецца, пра тое, як некалі крыўдзіў аднакласніцу і ўдзельнічаў у цкаванні аднакласніка, пра пабітых у дзяцінстве катоў ды галубоў, пра здрады дзяўчатам. Якой толькі, аказваецца, дрэні не паспеў ён нарабіць за нядоўгае жыццё! Не, не забіў, канешне, нікога, не згвалціў. Аднак усё адно душна і цяжка. І спёка гэтая за акном, і адзінота.

Трэба на працу. Там хлопцы, там можна забыцца на ўсё.

НА рабоце майстар чапляецца. Сябры гэта бачаць і ўсё больш падбухторваюць распачаць вайну і адпомсціць. Толькі Антон цягне, не спяшаецца. Да сораму перад пакрыўджанай жанчынай дадалася яшчэ і трывога. Ва ўзрушаным стане нездаровы чалавек можа зрабіць з сабой усялякае. А станавіцца прычынай бяды дакладна не хочацца.

Вось Антону і здаецца, што калі зрабіць штосьці добрае, не рабіць болей зла, то павінна стаць лягчэй. Быццам гэта залічыцца, і строгі ўнутраны суддзя даруе. Асабліва калі адмова ад помсты ідзе поруч з неабходнасцю цярпець штодзённыя крыўды. Антон канчаткова вырашае прабачыць майстру ягоную дурасць, а яшчэ неяк паведаміць Юлі, што яна яго не цікавіць. Сябры на такое крывяць вусны ды выказваюць сумненні наконт наяўнасці ў Антона поўнага камплекта мужчынскіх прыкмет. Антон цвёрда трывае і гэта.

ПАВОЛЬНА цягнуцца парныя ліпеньскія дні. Здаецца, што каля горада стаіць нерашучая навальнічная хмара, якая здолела выгнаць з вуліц свежае паветра, але ніяк не можа наважыцца абрынуць на галовы гараджан патокі вады. Антон з прыкрасцю адзначае, што яго план не прыносіць палёгкі. Спрабуе пераключыцца на гулянкі з сябрамі, алкаголь і цяжкую працу. Ды ўсё марна: як толькі ён застаецца сам-насам з сабой, тут жа прачынаецца сумленне ды вяртаецца туга. Антон пачуваецца ў нейкай бясконцай лазні, з якой няма выхаду і ў якой паддаюць і паддаюць ваду на каменне.

Таму на трэцім тыдні ён вырашае пачаць пошукі незнаёмкі. Антон не ведае, што будзе рабіць, калі сустрэне яе, што будзе ёй гаварыць. Ды ён нават і не ўпэўнены, што сустрэне яе. Аднак сядзець і пакутаваць болей не можа.

Кожны дзень пасля працы ён бадзяецца па набярэжнай, корміць качак і назірае за тым, як за шэра-сінюю дымку штовечар коціцца агніста-чырвонае сонца. Ён адчувае, што толькі цяпер, пасля таго як пачаў дзейнічаць, на душы стала трохі лягчэй.

ТАК мінае амаль тыдзень, аднак пошукі не прыносяць плёну. У суботу пад вечар Антон ходзіць каля вады і назірае, як у чароце хаваецца выдра, пакуль яго позірк не падае на бераг. Там між дрэваў на невялікай паляне і даволі блізка ад сябе хлопец заўважае знаёмую сукенку і ўсё тую ж белую хустку. Жанчына сядзіць на кукішках бокам да Антона і нешта шукае пад высокай хвояй. Антон прыглядаецца і бачыць, што адной рукою яна прыціскае да сябе хваёвыя шышкі. Хлопец пачынае хвалявацца, з галавы імгненна вылятаюць прыдуманыя словы, якімі ён планаваў выбачацца. Нейкі час ён глядзіць сабе пад ногі, пакуль не наважваецца падысці. Жанчына чуе, як ламаецца галлё пад яго нагамі, выпростваецца. Глядзіць на Антона са здзіўленнем і добразычлівасцю, быццам убачыла прыгожую лясную жывёлу.

АНТОН не ведае, як пачаць гутарку, выціскае з сябе толькі ціхае ды фармальнае «прывітанне». Яна не адказвае, усміхаецца.

— Некалькі тыдняў таму, — пачынае ён, — я вас моцна пакрыўдзіў. І вось цяпер... — голас Антона дрыжыць, ён сціскае пальцы, уздыхае, — гэта самае, цяпер, э-э-э, я вырашыў знайсці вас і выбачыцца. Бо, шчыра кажучы, пачуваюся неяк... ну, гэта, неяк, гмх, няўтульна. Таму прабачце, калі ласка. І калі я нешта магу зрабіць, каб вам забыцца на тыя кветкі і на тое, што я накрычаў...

Але тут нечаканае пытанне перарывае яго патугі:

— Даруйце, што вам трэба ад маёй сястры?

Перад хлопцам паўстае таксама сталая жанчына, усім сваім строгім выглядам яна нагадвае ці то настаўніцу, ці то доктарку. «Яшчэ і сястра тут як тут. То нікога знайсці не мог, а то ўсе разам на мяне як з неба зваліліся».

Ён вінавата ўсміхаецца новай знаёмай.

— Я зараз усё растлумачу. Некалькі тыдняў таму так склаліся абставіны, што я... Як бы тут правільна сказаць... Карацей, я на вашу сястру накрычаў. Нахаміў ёй. В-о-о-сь. Не ведаю, што на мяне найшло. Мы з сябрамі гутарылі, а тут яна са сваімі кветкамі. А ў мяне тады яшчэ якраз праблемы на працы былі... Я яе пакрыўдзіў, яна заплакала і ўцякла. Таму я вырашыў, што знайду вашу сястру і папрашу прабачэння. Мяне, па шчырасці, сумленне грызе.

Погляд суровай жанчыны мякчэе.

— Як вас завуць, малады чалавек? — мірна пытаецца яна.

— Антон.

— Дзякуй вам, Антон, за выбачэнні. І не хвалюйцеся. Яна не памятае, што вы яе пакрыўдзілі.

— Як так? — здзіўляецца хлопец.

— Хіба вы не заўважылі, што яна не такая, як усе?

— Заўважыў, так.

— Яна — хворы чалавек, Антон. Яна жыве ў сваім свеце, дзе ёй то гадоў трынаццаць-чатырнаццаць, а то і пяць-шэсць, дзе кожны новы дзень — новае жыццё. Яна вас папросту не памятае. Таму і не крыўдуе.

Антон з жалем глядзіць на хворую, а тая, заўважыўшы такі сумны позірк, усміхаецца і працягвае хлопцу некалькі шышак. Ён бярэ іх, усміхаецца ў адказ: «Дзякую. Шчыра дзякую!»

Жанчына смяецца, радасна гаворыць сястры:

— Глядзі, Волька, узяў мой падарунак. Такі прыгожы і ўзяў мой падарунак!

— Бачу я, бачу, — прытворна радуецца сястра, а потым дадае Антону: — Вы добры хлопец. Не хвалюйцеся і бывайце, мы пойдзем дадому.

Яна бярэ сястру за руку:

— Алена, развітвайся з Антонам, нам трэба ісці.

Алена моўчкі махае рукой, і жанчыны сыходзяць.

АНТОН павольна ідзе на набярэжную, да лавак. Ён занураны ў думкі, нават ціха мармыча сабе пад нос.

Ніякай справядлівасці няма ў гэтым свеце. Адзін жыве ўсё жыццё мярзотнікам і ніякіх праблем з сумленнем не мае, ніколі ні пра што не турбуецца. А тут зрабіў не самы страшны ўчынак, пасля столькі думаў пра гэта, хваляваўся. Потым вырашыў выправіць сітуацыю. І што з таго? Тая няшчасная не памятае, таму і прабачыць не можа. А ты памятаеш усё. І таму сабе прабачыць не можаш, бо не перад сабой вінаваты. І куды ад гэтага падзецца, хто цяпер дасць табе вольную?

А ніхто. Цяпер цягай сваю ганьбу з сабой.

Ён займае першую вольную лаўку і доўга яшчэ сядзіць, асцярожна трымаючы ў руках колькі хваёвых шышак.

**Вадзім КРУК.**

SEX-БАЛЯСЫ

# ІМЯ, СЯСТРА, ІМЯ!

**Памятаеце гэты палымяны зварот англійскага двараніна Фэлтана да вераломнай Міледзі — вядомы ўсім мем з экранізацыі рамана Аляксандра Дзюма «Тры мушкецёры»? Бо, сапраўды, усё так, імя мае значэнне, і не адно. («Люся спыніла аднасіны з Віталікам, калі даведалася, што ён купіў алмазны дыск для нейкай «балгаркі».) Апроч уласнага яно можа адыгрываць ролю хадзячай назвы, абазначаючы, напрыклад, клас, да якога адносіць сябе нехта. Працяг жа таксама не забыліся з фільма: «Я салдат, спадарыня! І выконваю загад герцага... няважна, якога герцага!» («Пра чалавека можна вельмі шмат сказаць, калі проста паназіраць за тым, як ён швартуе сваю яхту».) Але мы пагаворым сёння найперш пра імя ўласнае. («— Софачка, дазвольце вамі зачаравацца?! — А рукамі чапаць будзеце? — Не, канешне. — Ну а сэнс тады?») Ведаеце, сышлося тут нядаўна ў адзін пазл...**

Не сакрэт, што да выбару імя свайго героя вельмі сур'ёзна ставяцца аўтары літаратурных твораў. Усё з той жа стужкі-крыніцы: «Прабачце, Ваша праасвяшчэнства, але для Атоса гэта занадта многа... а для графа дэ Ла Фэр — занадта мала». Спрадвеку ўласнае імя вельмі шмат значыла для любога чалавека. («На Русі муж называў жонку «душа мая». А жонка мужа — «свято вачэй маіх». І ніякага заапарка».)

На імя мы заўсёды звяртаем увагу пры знаёмстве. Памятаеце мілотны і міжвольны фліртд'Артаньяна на ўзбярэжжы? «— Як завуць гэта чароўнае стварэнне? — Кэт, Кэці...» («Артурчык быў настолькі выхаваным і далікатным хлопчыкам, што пакінуў у пад'ездзе надпіс: «Каця непастаянная».) Тут галоўнае — не памыліцца. («— Вой, Яшанька, як вы сябе маеце? Гаворыць, вы ўдала ажаніліся? Хто пазнаёміў вас з вашай жонкай? — Я нікога не абвінавачваю...»)



Канешне, з цягам часу ўсё змянілася. («Калі прайсці міма дзіцячага сада, дык можна адчуць сябе ў Сярэднявеччы: Платон б'е Елісея, Расціслаў раве, а Светазар «намачыў штонікі».) Увогуле, па імені чалавека можна з вялікай доляй верагоднасці вызначыць яго ўзрост. («Калі жанчына не хоча гаварыць, колькі ёй гадоў, спытайце, хто яна па знаку задыяка. Вы зможаце самі вызначыць яе ўзрост з хібнасцю плюс-мінус дванаццаць гадоў».) Калі нехта носіць імёны Андрэя, Сяргея, Колі, Пашы, Надзеі, Марыны, магчыма, што іх носьбітам ад 40 да 50. І менталітэт у іх адпаведны. («14 лютага... 23 лютага... 8 сакавіка... А давайце іх аб'яднаем у адно свята і назавём яго Міжнародным днём жанчын, закаханых у абаронцаў Айчыны!») Дар'і, Паліны, Наташы, Дзімы, хутчэй за ўсё, будуць прыкладна ўдвая маладзейшыя. («— Калі ласка, бутэлечку піва. — Пашпарт. — Няма з сабой. — Добра. «Тополиный пух...»? — «Жара, июль!» — Вам якое піва?») Ну а Міраславу, мабыць, зараз каля дзесяці.

Імя можа намякаць на характар свайго носьбіта. («Леанід такі важны, што пра яго не скажаш: спіць. Хочацца сказаць: заняты сном».) Або на дзелавыя якасці. («Як гаварыла цётка Ціля: «Запомні, Сарачка, шо я табе скажу: прыбіць паліцу можна і суседа папрасіць. А вось накрычаць, шо крыва прыбіта, — тут такі муж патрэбны!») Дык да чаго гэта я?

Нейк да Дня абаронцаў Айчыны расійская праграма для знаёмстваў склала рэйтынг самых прыцягальных мужчынскіх імёнаў, уладальнікі якіх найчасцей карыстаюцца ўвагай жанчын. («Званок па тэлефоне: — Вася, прывітанне, даўно цябе не чуў! Як табе жыццё пасля вяселля? — Я ніколі не быў такім шчаслівым! — Яна, што, побач? — Я вельмі задаволены! — Трымайся, братан...») На першым месцы ішоў Дзмітрый, потым Цімафей, Багдан, Максім, Яраслаў, Андрэй, Павел, Антон, Канстанцін і Юрый. Ну, я думаю, да гэтага спіса трэба ставіцца спакойна. Склалі і склалі, абы людзі добрыя былі і ўсё ў іх атрымалася. («Фразай «не сыходзь, у мяне двое дзяцей» Віка толькі ўзмацніла няўдаласць першага спаткання».) У рэшце рэшт, яны не самі сабе імёны выбіралі, а іх бацькі.

З гэтай нагоды больш цікавая інфармацыя з сеціва пра тое, як у розных краінах імкнуцца засцерагчы сваіх нованароджаных грамадзян ад празмернай творчасці ў гэтым працэсе мам і татаў. У многіх дзяржавах законы, якія рэгулююць працэс надання дзіцяці імя, грунтуюцца на простым прынцыпе: яно не павінна гучаць як непрыстойнае або крыўднае слова, а таксама не павінна дастаўляць непрыемнасці ў будучыні. («А давайце разыграем Вадзіка! — Шчыра кажучы, сумнеўны прыз...») У Францыі, напрыклад, сярод забароненых імёнаў — Нутэла, Клубніцы. («Каця пастарэла, і да надпісаў у пад'ездзе сталі дадаваць слова «цётка».) У Расіі з 2017 года забаранілі называць дзяцей у тым ліку лічбамі. («— Я сёння агент 0,7. — Можа, 007? — Не, нясі агуркі!») У Аўстраліі забаронена ў імёнах выкарыстоўваць тытулы і званні. Вяртаючыся да мушкецёраў: «Ганна дэ Бэйль, лэдзі Кларык, Шарлота Баксан, графіня дэ Ла Фэр, лэдзі Вінтэр... Бачыце — вас так многа, а мяне так мала...» У Партугаліі нельга стаць Нірванай і Вікінгам, у Даніі — Малпай, у Мексіцы — Рабакопам і Трусамі, у Малайзіі — Вар'ятам, у Швейцарыі — Мерседэсам... Пагадзіцеся, забаранілі такія імёны — і правільна зрабілі. («Сёння хацелася б працытаваць Вітаса: «ААААА ААААА ААААА».)

...Нікога не хацеў пакрыўдзіць, каго не назваў — даруйце.

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Стрымліваю ў сабе авантурызм»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Вы перш за ўсё выкладчык. Як адчуваеце сябе ў гэтай ролі?***

— Я шчаслівы чалавек, бо мне падабаецца мая работа. На факультэце адчуваю сябе не адарваным ад жыцця — у маладзёжнай тусоўцы: кожны год на пары прыходзяць новыя студэнты. Памятаю, калі ўпершыню заходзіў у аўдыторыю, яны глядзелі на мяне з цікавасцю і здзіўленнем — выглядаў я молада, нетыпова, не як дацэнт ці прафесар.

Вучыцца я люблю і ўмею, таму паглыблены ў навуку ўжо са студэнцтва — з другога курса. За тры гады выкладання ва ўніверсітэце ў маім арсенале сабралася каля 15 навучальных дысцыплін. Лічу, што асноўныя сілы трэба аддаваць нейкай адной справе, і я ўпэўнены, што іду па правільным шляху. Мая творчая іпастась непастаянная, легкадумная. Гэта дапамагае на сцэне, але часам перашкаджае ў іншым. Таму стрымліваю ў сабе авантурызм, бо маю сям'ю, за якую адказваю.

***— Які вы педагог?***

— Лічу, што дэмакратычны, справядлівы. Строгасці не люблю — не дзейнічае, але мецьсумленне іншы раз заклікаю. Перадач за ўвесь час было няшмат. Я не тэрарызую дзяўчат і хлапцоў падчас семестра, не мучаю іх на заліках, але патрабаванні прад'яўляю сур'ёзныя. Некаторыя мяне ва ўсяляківыпадак пабойваюцца. Наогул, стараюся праводзіць заняткі ў інтэрактыўным фармаце. Люблю, калі студэнты самі прадстаўляюць уласныя праекты і робяць прэзентацыі. Практыкую «праглядальныя» пары, часам забаўляльныя: уключаю студэнтам фільмы, інтэрв'ю і розныя шоу. Журналіст павінен быць не толькі начытаным, але і «нагледжаным».

***— Дзмітрый, вы былі ўдзельнікам тэлевізійных праектаў «Акадэмія талентаў», «Імперыя песні», перамаглі ў песенным конкурсе «Заспявай 3.0» — няблага. Але кажаце пра спевы як пра захапленне. Артыстычная кар'ера для вас толькі хобі?***



— Мне заўсёды здавалася, што сцэнічны свет цікавейшы, чым рэальны. Адчуваю сябе перад публікай свабодна. Будучы студэнтам журфака, за адзін год я выступіў на 37 канцэртах, якія ладзіліся на пляцоўках БДУ, за што атрымаў дыплом «Студэнт года» ў намінацыі «Культура». У 2016 годзе разам з Вольгай Сацюк мы перамаглі на песенным конкурсе «Заспявай 3.0» з кавер-версіяй хіта Эраса Рамацоці Più Che Puoi на беларускай мове (з новай назвай «За табой»). Выпусцілі акустычнае відэа, якое хутка набрала папулярнасць у сеціве. А ў 2017 годзе адбыўся мой першы сольны канцэрт — неверагодныя адчуванні.

На журфаку многія студэнты ведаюць, што я спяваю. Нядаўна адкрыў «Інстаграм», гартаю стужку, а на відэа студэнтка робіць хатняе заданне. Прыслухаўся — фонам у пакоі дзяўчыны грае мая песня «Ключы». Безумоўна, прыемна, што яна падабаецца людзям, але лічу, што для таго, каб стаць паспяховым артыстам, трэба прысвячаць сябе творчасці цалкам, ахвяруючы нечым іншым. Трэба быць гарачым, бясстрашным... і прадпрымальным. Сцэна не любіць паўтонаў, сцэна любіць поўную пагружанасць і аддаchасць. Я ж чалавек зямны, кіруюся правілам «лепш сініца ў руках, чым журавель у небе».



***— Праўда, што вас запрашалі на кастынг «Хачу да Меладзэ»?***

— Так. У 2014 годзе прайшоў адбор у Мінску, пасля запрасілі ў Маскву. Цікава, што перад тым, як я даведаўся, каго шукае прадзюсар (бойзбэнд. — **Аўт.**), я напісаў у анкеце, што хачу займацца сольнай кар'ерай і не планую спяваць у гурце. Ужо пасля выступлення ў Расіі запрошаныя эксперты мне сказалі, што праспяваў я добра, але чагосьці ім не хапіла. Маўляў, «чартаўшчынкі», жарсці. Але дзе я, а дзе «чартаўшчынка»!

**«Практыкую «праглядальныя» пары, часам забаўляльныя: уключаю студэнтам фільмы, інтэрв'ю і розныя шоу. Журналіст павінен быць не толькі начытаным, але і «нагледжаным».**

***— У вас ёсць не толькі любімая праца, хобі, але і выдатная сям'я. Шчаслівы чалавек!***

— З Кацяй мы разам з 16 гадоў. Вучоба ў розных гарадах не стала перашкодай для стварэння сям'і — на пятым курсе мы пажаніліся, і ў нас расце цудоўная дачка Ніка. Я аднаглюб, лічу, што няма нагоды чагосьці чакаць, калі можна ўсё зрабіць адразу. Лепшага моманту не будзе. Знайшлі сваю другую палавінку — усім раю, пажаніцеся!

***— Як выглядае ваш ідэальны дзень?***

— Прачнуцца а 10-й гадзіне раніцы, выпіць кавы з малаком і з чымнебудзь салодкім, прыняць гарачы душ, пагуляць з жонкай і дачкой па парку і адправіцца ў другую змену на працу. Правесці дзве-тры пары, вярнуцца да сям'і, пачытаць кніжку, паглядзець любімую кулінарную перадачу ў «Юцьюбе» і легчы спаць да поўначы. Але, на жаль, ці на шчасце, такога не бывае. Кладуся часам так позна, што можна і не класціся. Устаю з вялікай цяжкасцю, асабліва да ранніх пар. А пасля пачынаецца мітусня. Яшчэ і канцэрты па вечарах і на выхадных. Чым больш актыўнасці, тым больш паспяваю.

***— Дзмітрый, якія творчыя планы на найбліжэйшы час?***

— Планую і надалей ствараць прыгожыя кампазіцыі, удзельнічаць у конкурсах, быць «на хвалі» беларускай артыстычнай тусоўкі. Вельмі люблю і паважаю беларускую мову, таму чакайце ад мяне мілагучных песень!

**Дар'я ШЛАПАКОВА,**
**студэнтка IV курса**
**факультэта журналістыкі БДУ.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 06.02.2019 г.

**УВЕДОМЛЕНИЕ**
**о формировании реестра владельцев первого выпуска облигаций общества с ограниченной ответственностью «Темпл Сити»**

Общество с ограниченной ответственностью «Темпл Сити», регистрационный номер 192280260, с местонахождением по адресу: 220043, г. Минск, пр-т Независимости, 95/1, комн. 7, уведомляет, что 5 февраля 2019 г. директором Общества с ограниченной ответственностью «Темпл Сити» приятно решение о формировании реестра владельцев первого выпуска облигаций (регистрационный номер 5-200-02-3064) по состоянию на 6 февраля 2019 г.

УНП 192280260

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14

**Продавец:** торговое унитарное предприятие «Глубокский магазин оптовой торговли», Витебская обл., г. Глубокое, ул. Полевая, 24, тел. 8 (02156) 2-80-02

Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 220/С-15605, площадь – 537,7 кв. м, расположенного по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н. г. Глубокое, ул. Полевая, 24, наименование: одноэтажное кирпичное здание магазина оптовой и комиссионной торговли, назначение – здание специализированное организаций оптовой торговли, материально-технического снабжения и сбыта продукции, составные части и принадлежности: пристройка, сарай. Капитальное строение с инвентарным номером 220/С-27516, площадь – 79,6 кв. м, расположенного по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Полевая, 24/1, наименование – гараж, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта. Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 221550100001000306 (право постоянного пользования).
**Начальная цена**: 130 924,00 бел. руб. без НДС. Задаток: 13 092,40 бел. руб.

**Дата, время и место проведения аукциона:** 11.03.2019 в 12.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 07.02.2019 с 8.30 по 07.03.2019 до 16.30. Срок заключения договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней со дня проведения аукциона, оплата объекта производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке объектов продажи, оплата НДС сверх цены продажи объекта

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ.лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона, в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566.** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by

**ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион**

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690-54-09, **WWW.BELTORGI.BY**

Продавец: ООО «БИКАМСЕРВИС» (УНП 690602681) в лице антикризисного управляющего ИП Осиповича Д. И.

Повторные публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены: **6 марта 2019 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **WWW.BELTORGI.BY.** Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в «Сельской газете» от 06.12.2018 г.

| № п/п | Предмет торгов, местонахождение | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инв. № 640/D-49446, площадью 406,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Слуцк, ул. Богдана Хмельницкого, 47Г-2, включающие в себя неотделимые улучшения:<br>– охранно-пожарная сигнализация 30.11.2015 г., инв. № 0000144,<br>– 1/2 автоматическая система пожарной сигнализации, инв. № 00000092,<br>– 1/2 охранная сигнализация, инв. № 00000021,<br>– 1/2 система автоматического водяного пожаротушения, инв.№00000100,<br>– 1/2 система видеонаблюдения, инв. № 00000018,<br>– 1/2 система видеонаблюдения 2015 г., инв. № 0000138,<br>– 1/2 система охранной сигнализации 2015 г., инв. № 0000132 | 166 160,00 |
| 2 | Изолированное помещение с инв. № 640/D-75788, площадью 369,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Слуцк, ул. Богдана Хмельницкого, 47Г-5, включающие в себя неотделимые улучшения:<br>– охранно-пожарная сигнализация, 3-й этаж, инв. № 0000099,<br>– 1/2 автоматическая система пожарной сигнализации, инв. № 00000092,<br>– 1/2 охранная сигнализация, инв. № 00000021,<br>– 1/2 система автоматического водяного пожаротушения, инв. № 00000100,<br>– 1/2 система видеонаблюдения , инв. № 00000018,<br>– 1/2 система видеонаблюдения 2015 г., инв. № 0000138,<br>– 1/2 система охранной сигнализации 2015 г., инв. № 0000132 | 155 290,00 |

Контактные телефоны для ознакомления и осмотра: +37529 6226681, +37529 6581920.

**Для участия в торгах необходимо** в срок **по 5 марта 2019 г. 17.00:** 1) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY06SOMA30120013860101000933 в ЗАО «Идея Банк», код SOMABY22, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация», 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY, 3) направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее – в информации лота на сайте WWW.BELTORGI.BY).

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет электронных торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем электронных торгов в течение пяти дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи предмета торгов

# СТАЎКА НА РУПАРА



**Алег ЧЭКІН і Марсэліта добра разумеюць адно аднаго.**

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Апошнія дзесяць гадоў суразмоўнік займаўся тым, што разводзіў коней як аматар, а два гады таму вырашыў зрабіць хобі справай жыцця. І зараз імкнецца да таго, каб бізнес быў на ўзроўні.

— А чаму не займацца? — паціскае плячыма Юрый. — Мясцовая ўлада падтрымлівае. Ды і ўмовы вядзення бізнесу задавальняюць. Калі аформіўся, былі паслабленні. Тры гады без падаткаў, з палівам дапамагаюць — адным словам, падтрымка вялікая. Выдзелілі зямлі 240 гектараў — больш узаром, болей атрымаем збожжа і сена. Для коней гэта асноўная ежа. Стварыў пяць рабочых месцаў, аднаму з такімі аб'ёмамі не справіцца. Ёсць надзейныя памочнікі. Адзін з іх — сябра Аляксандр Клачко з пасёлка Шырокі. У яго свая падсобная гаспадарка. Я яму дапамагаю, ён мне. Трактарыст Аляксандр Саўчанка з вёскі Сідарахка добра нарыхтоўвае кармы. Усе хлопцы майстры сваёй справы. Разам прасцей зарабіць. Калі адно аднаму дапамагаць, заўсёды выйграеш. Нехта сена нарыхтуе, нехта дапаможа з будаўніцтвам. Тым больш калі гаспадарка вялікая. Акрамя коней, напрыклад, вырошчваю яшчэ і бычкоў на продаж.

**Старшыня Краснапольскага райсавета дэпутатаў Анжаліка ГОМАН:**

— Бізнес і ўлада ў нас у раёне добра супрацоўнічаюць. Робім стаўку на жывёлагадоўлю і лес. Ёсць прадпрымальнікі, якія займаюцца гэтым па-сур'ёзнаму. Наогул, для раёна ініцыятыўныя, актыўныя людзі заўсёды знаходка. А Юрый Зямцоў не толькі прадпрымальнік, ён яшчэ і дэпутат сельскага і раённага Саветаў. Заўсёды ідзе насустрач пажаданням насельніцтва. Як прадпрымальнік стварыў новыя рабочыя месцы ў рамках рэалізацыі Дэкрэта № 3. Важна, што такія людзі застаюцца ў раёне і займаюцца развіццём сваёй тэрыторыі.

## АГРАСЯДЗІБА З СЯЛЯНСКІМ УХІЛАМ

У Гарадзецкай поўным ходам ідзе будоўля. Прадпрымальнік за адну базавую выкупіў былую пачатковую школу, якая некалькі гадоў пуставала. Непадалёк зроблена прасторная альтанка, дзе можна будзе добра правесці час у даждлівае надвор'е. А вось у драўляным будынку школы плануе зрабіць вялікую банкетную залу і пакой для адпачынку.

Унутры кіпіць работа. Ужо зроблены каміны і вялікая руская печка. У печцы гарыць агонь, у памяшканні цёпла і прыемна пахне свежым дрэвам. Будучая банкетная зала ўражвае памерамі. Сцены, удакладняе гаспадар, будуць драўляныя, на адной з іх — карціна на ўсю шырыню. Уяўленне тут жа пачынае маляваць нешта ў сялянскім стылі. Пакой для адпачынку размесціцца ў другім крыле будынка. Зараз там пакуль што адзін камін, але з цягам часу з'явіцца мяккая мэбля. Дарэчы, работы яшчэ ідуць, а людзі ўжо цікавяцца: калі можна заязджаць? Чуткі хутка распаўсюджваюцца.

Побач цагляны будынак, да якога яшчэ рукі не дайшлі. Але ён у добрым стане. З часам у ім адкрыецца гасцініца. З вокнаў яе будзе адкрывацца маляўнічы від.

Пералескі мяжуюцца з сенажацямі, спіць пад лёдам маленькая рачулка. Прыгожа. Гаспадар прадбачліва паставіў лаўку, і нават не адну. Летам пейзаж разбавіць табун коней, глядзець на якіх можна таксама бясконца, як і на агонь у каміне.

— Вясной яшчэ некалькі лавак пастаўлю, зраблю альтанкі, — дзеліцца планамі Юрый. — Збіраюся добраўпарадкаваць парк. Разам з будынкамі школы мне далі для абслугоўвання каля гектара зямлі ў арэнду. Летась пасадзіў каля трох сотняў маладых хвоек. Будуць абараняць аграсядзібу ад ветру. Ды і пах цудоўны.

Звяртаю ўвагу на пафарбаванае ў белы колер дрэва пасярод сядзібы. Гэта што, такі дызайнерскі ход? «Збіраемся такім чынам звярнуць на сябе ўвагу буслоў, — усміхаецца прадпрымальнік. — Зробім на ім яшчэ і аснову пад гняздо». Для аховы аграсядзібы і коней Юрый збіраецца зрабіць гадавальнік для туркменскіх алабаяў. Гэтыя вартавыя сабакі вельмі яму падабаюцца.

## СЦІПЛАЕ АБАЯННЕ ЛАМАВІКОЎ

Каняферма знаходзіцца крыху далей ад аграсядзібы. Там таксама вядзецца будаўніцтва, узводзяцца камфартабельныя апартаменты для коней.

На падворку шчыруюць людзі ў будаўнічай форме, за іх перамяшчэннямі ляніва назірае туркменскі алабай Шаман. Убачыўшы нас, пазяхнуў і пачаў манатонна брахаць. На выгляд дабрадушны, але яго лепей не злаваць, параіў гаспадар.

На гаспадарчым двары заўважаю сані — амаль музейны экспанат. А побач новыя, зробленым рукамі таленавітага тутэйшага майстра Дзмітрыя Казлова. У фермера ёсць планы катаць гасцей на навагоднія святы.

У загоне адпачываюць коні. Каля іх завіхаецца Алег Чэкін. «Сена, вада, соль, авёс — галоўны рацыён нашых гадаванцаў, — кажа ён. — На гэтым і вырастаюць асілкі. Пакуль у нас восем жарабят, але хутка яшчэ будуць». Ён падзывае да сябе Марсэліту. Кабылка крыху саромеецца, але ж пазіруе для фота. І не хавае сваіх пачуццяў да канявода.

Цяжкавозы — менавіта тыя коні, на якіх робіць стаўку Юрый Зямцоў. Спартыўныя, вядома, прыгажэйшыя, але ім і догляд болей далікатны патрэбны. Цяжкавозы больш вынослівыя і амаль не хварэюць. У табуне Зямцова каля 30 коней гэтай пароды. Ёсць жаданне купіць яшчэ і ўладзіміраўскага жарабца для верхавой язды, ужо і перагаворы вядуцца.

Прызнаюся, пасля сустрэчы з гэтымі веліканамі сімпатыі да іх у мяне дадалося. Асабліва ўразіў Рупар — гняды конь з доўгай чорнай чупрынай на вачах. Выгляд у яго як на карціне Васняцова з трыма асілкамі. Напэўна, менавіта на такім калісьці ездзіў Ілья Мурамец.

— Засталося купіць Рупару добрую збрую, і наогул прыгажун будзе, — кажа Юрый. — Плануем выездзіць некалькі коней, каб на святы катаць людзей.

Кабылкі пасуцца асобна. Кармоў для іх нарыхтавана з запасам, на мой погляд, не на адзін табун хопіць. «Дзяўчаты» спачатку на нас не рэагуюць. Потым адна з іх адрываецца ад ежы і накіроўваецца да гаспадара. «Гэта сяброўка Рупара», — знаёміць Юрый і ласкава дадае: — Зорачка. Адчуваецца, што яна галоўная ў гэтым



**Зорачка — галоўная ў жаночым «батальёне».**



**Сані для турыстаў.**

жаночым «батальёне». За ёй падцягваюцца і іншыя — сівая, шэрая, рудая, руда-рабая. Ну якія ж яны прыгажуны, вока не адвесці. Здаецца мне, што бізнес у Юрыя добра пойдзе. Не захапіцца коньмі нельга. Абавязкова захочацца сустрэцца з імі яшчэ раз.

— Вельмі важна застацца менавіта на сваёй тэрыторыі і неяк яе развіваць. Малая радзіма — гэта вечнае, — дзеліцца напаследак думкамі Юрый Зямцоў. — Я нават вырашыў паспрабаваць сябе ў ролі дэпутата. З людзьмі заўсёды быў у добрых адносінах, я ж тут раней ветэрынарам працаваў. Калі звяртаюцца, не адмаўляю. Вось павільён для жыхароў вёскі Мядзвёдаўка разам са сваімі работнікамі зрабіў. Я сябе знайшоў на радзіме і задаволены. Добра, дзе нас няма. З'язджаюць тыя, хто сябе на радзіме рэалізаваць не можа. Мы ж спраўляемся. Трэба ставіць мэту і дабівацца. А цяжкасці паўсюль можна знайсці. Я не гарадскі чалавек, мне даспадобы вёска.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## Информационное извещение о проведение аукциона в ОАО «Стройтрест № 3 Ордена Октябрьской революции»

| | |
|---|---|
| Наименование объекта | Право заключения договора аренды недвижимого имущества |
| Местонахождение недвижимого имущества | Минская область, г. Солигорск, проезд Строителей, 5/24 |
| Общая площадь, кв. м | 23,0 |
| Характеристика объекта | Нежилое помещение, электрифицировано, центральное отопление, водоснабжение |
| Предполагаемое целевое использование | Офис |
| Начальная цена продажи права заключения договора аренды, руб. | 92,63 |
| Сумма задатка, руб. | 9,26 |
| Форма проводимого аукциона | Открытый аукцион |
| Условия продажи предмета на аукционе | Заключение договора аренды на 3 года с применением коэффициента, устанавливаемого арендодателем в зависимости от спроса на недвижимое имущество, его технического состояния и коммерческой выгоды от сдачи в аренду и (или) от использования арендуемого имущества, в размере 3 (трех) |

Примечание

Организатор аукциона: открытое акционерное общество «Стройтрест № 3 Ордена Октябрьской революции», г. Солигорск, ул. Козлова, 37.

Аукцион состоится 15 марта 2019 года в 09.30 по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 37, малый зал.

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 37, каб. № 324:

– понедельник – пятница с 08.45 до 17.15, в срок по 11 марта 2019 г. включительно. Телефон для справки 8 (0174) 22-55-34.

Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

3.2. юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь:

– копию документа, подтверждающую государственную регистрацию юридического лица;

– копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

3.3. юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь:

– легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

– копию платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

3.4. индивидуальному предпринимателю:

– копию документа, подтверждающую государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

– копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

3.5. физическому лицу:

– копию платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.

4. При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения:

– физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность;

– представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится при наличии не менее двух участников. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов максимальную цену. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. В случае отказа победителя (лица, приравненного к победителю аукциона) от подписания протокола о результатах аукциона, возмещения организатору аукциона суммы затрат на организацию и проведение аукциона, подписания договора аренды победитель (лицо, приравненное к победителю аукциона) уплачивает штраф в размере 20 базовых величин.

Стороны подписывают договор аренды недвижимого имущества в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

Победитель аукциона в предусмотренных законодательством случаях обязан представить справку финансовых органов о декларировании объемов источников инвестиций.

**Реквизиты расчетного счета для внесения задатка:** ОАО «Стройтрест № 3 Ордена Октябрьской революции», УНП 600122771, на расчетный счет № BY90PJCB30121000011000000933 «Приорбанк» ОАО ЦБУ 104 г. Солигорск, БИК PJCBBY2X.

## Извещение о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды имущества учреждения по хранению материальных ценностей «Поречье»

Аукцион состоится **11 марта 2019 года в 12.00** по адресу: г. Бобруйск, ул. Войкова, 20, 3-й этаж, конференцзал.

Организатор аукциона: филиал «Бобруйский региональный инновационный центр развития бизнеса» ОАО «Отель «Турист», г. Бобруйск, ул. Шинная, 13, каб. 414, контактный телефон организатора аукциона для уточнения и получения дополнительной информации 8 (0225) 436372.

Арендодатель: учреждение по хранению материальных ценностей «Поречье», тел. 8 (0225) 703801. С объектом можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни недели с 8.00 до 17.00, предварительно согласовав время с арендодателем.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Бобруйск, ул. Войкова, 20, кабинет организатора торгов начиная со дня публикации извещения. Последний день приема заявлений и внесения задатка – **6 марта 2019 года до 13.00**

| № лота | Предмет аукциона, место нахождения | Общая площадь, кв. м | Начальная цена, руб. | Размер задатка, руб. | Условия/ срок заключения договора аренды | Коэффициент к базовой ставке арендной платы | Размер штрафа |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 710/С-10831, г. Бобруйск, ул. Рокоссовского, 17/23 | 108,9 | 438,59 | 40,00 | По соглашению сторон / 5 лет | 1,1 | 20 % от цены продажи* 5 базовых величин** |

Для участия в аукционе в срок, указанный в извещении, подается заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет филиала «Бобруйский региональный инновационный центр развития бизнеса» ОАО «Отель «Турист», р/с BY98BAPB30122958500160000000 ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X, УНП 701484800 с отметкой банка; юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию индивидуального предпринимателя; физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность; представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, перечисленные выше, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона определяется постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 8 августа 2009 года № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 7 мая 2009 г. № 238». Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней, со дня его проведения, обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Условия оплаты: разовый платеж.

